Юры Грыбоўскі
(Варшава)

Службы бяспекі ПНР і „беларускія нацыяналісты ў Польшчы і іх палітычныя цэнтры на Захадзе” (1945-1974)

У пасляваеннай Польшчы знаходзілася каля 150 тыс. грамадзян беларускай нацыянальнасці. Пераважную большасць з іх складалі аўтахтонныя жыхары польска-беларускага памежжа, якія пражывалі ў Беластоцкім ваяводстве[1]. Аднак пэўная колькасць польскіх беларусаў, якія паходзілі з Навагрудчыны, Віленшчыны і Палесся, пасля заканчэння Другой сусветнай вайны аселі на тэрыторыі цэнтральных, паўночных і заходніх ваяводстваў Польшчы. Толькі ў апошнія гады з'явіліся працы, прысвечаныя жыццю беларусаў у некаторых рэгіёнах краіны[2].

Большасць са згаданых беларусаў трапілі ў Польшчу ў 1944-1946 гг. Прычынай гэтага былі падзеі Другой сусветнай вайны. Сярод эмігрантаў пэўную частку складалі былыя ўдзельнікі беларускіх арганізацый і вайсковых фармаванняў, створаных падчас нямецкай акупацыі. У СССР гэтых людзей за супрацоўніцтва з немцамі чакала пекла сталінскіх лагераў. Неўзабаве, напрыканцы вайны, а таксама ў першыя пасляваенныя гады, некаторым беларусам удалося трапіць у Польшчу, дзе яны былі вымушаны жыць пад чужымі прозвішчамі і хаваць сваё мінулае ад суседзяў. У палітычным сэнсе пераважная большасць гэтых людзей не змяніла сваіх перакананняў і поглядаў, таму і надалей заставалася ворагам савецкай улады. У сувязі з гэтым яны сталі аб'ектам пільнай увагі польскіх і савецкіх службаў бяспекі. Дасюль, аднак, застаецца па-за ўвагай даследчыкаў такая старонка ў гісторыі беларускай меншасці ў Польшчы, як стаўленне службаў бяспекі паваеннай Польшчы да нацыянальна свядомай і палітычна актыўнай часткі грамадзян гэтай нацыянальнасці. У тагачасных дакументах, якія ствараліся службамі бяспекі Польшчы, згаданая катэгорыя грамадзян акрэслівалася назвай „беларускія нацыяналісты”. З пункту гледжання

[1] Шырэй: E. Mironowicz, *Białorusini w Polsce 1944-1949*, Warszawa 1993; tenże, *Polityka narodowościowa PRL*, Białystok 2000.

[2] Шырэй: H. Głogowska, *Białorusini na Wybrzeżu Gdańskim*, Toruń 2003.

камуністычных улад да „нацыяналістычнай” дзейнасці залічваліся нават „праявы імкнення запаволіць натуральныя працэсы асіміляцыі”. На думку ўлад, да ліку „беларускіх нацыяналістаў” належалі асобы, якія „перад вайной і ў час акупацыі стваралі нацыяналістычныя арганізацыі, імкнучыся да ўтварэння самастойнай Беларусі з буржуазным дзяржаўным ладам”[3]. У Савецкім Саюзе гэтыя людзі называліся „калабарантамі” і абвінавачваліся ва ўсіх магчымых злачынствах супраць уласнага народа. Рэчаіснасць была, аднак, значна больш складанай. На нашу думку, трэба пераглядаць ужыванне тэрміна „калабарант” у дачыненні да беларусаў у гады Другой сусветнай вайны. Гэта тэма яшчэ чакае грунтоўнага і разважлівага даследавання. Аднак неаспрэчным фактам з’яўляецца тое, што перад пачаткам Другой сусветнай вайны Нямеччына многімі беларусамі ўспрымалася як відавочны хаўруснік, з якім звязваліся надзеі на адраджэнне беларускай дзяржаўнасці[4].

Парадаксальна, але спецслужбы ПНР побач з асобамі, якія падчас акупацыі супрацоўнічалі з немцамі, да групы т.зв. „беларускіх нацыяналістаў” залічвалі і некаторых беларусаў — былых жаўнераў Польскіх узброеных сіл на Захадзе, а таксама ўдзельнікаў польскага незалежніцкага падполля (былыя жаўнеры Арміі Краёвай) на тэрыторыі паўночна-ўсходніх ваяводстваў II Рэчы Паспалітай. Усіх іх камуністычная ўлада пераследавала з прычыны іх адмовы прыняцця палітычнага ладу, які панаваў у ПНР. Так, напрыклад, былы жаўнер Стаўпецкага згрупавання АК (камандзір — паручнік Адольф Пільх „Гура”) Антон А. у дакументах УБ характарызаваўся наступным чынам: „У выніку допыту (...) высветлілася, што ён з’яўляецца беларускім нацыяналістам, варожа ставіцца да Польшчы і СССР, на сходах выступае супраць разнастайных дзяржаўных мерапрыемстваў”[5]. Падобная характарыстыка тычылася колішніх беларускіх паліцыянтаў з мясцовасці Ракаў, якія адначасна былі ўдзельнікамі акоўскай канспірацыі[6]. Адзін з былых беларускіх паліцыянтаў з Браслава, а потым жаўнераў Віленскай акругі АК у 1953 г. беспадстаўна абвінавачваўся Міністэрствам грамадскай бяспекі (МГБ) у сувязі з „беларускімі нацыяналістамі” ў Заходняй Нямеччыне[7].

У перакананні „ўбэкаў” да „беларускіх нацыяналістаў” належылі асобы, якія нават не бралі ўдзелу ў Другой сусветнай вайне, але з’яўляліся нацыянальна свядомай часткай беларускай меншасці. У гэтым вы-

[3] *Służby bezpieczeństwa Polski i Czechosłowacji wobec Ukraińców (1945-1989). Z warsztatów badawczych*, red. G. Motyka, Warszawa 2005, s. 16.

[4] Шырэй: J. Turonek, *Białoruś pod okupacją niemiecką*, Warszawa 1993.

[5] Archiwum Instytutu Pamięci Narodowej (dalej: AIPN), sygn. 00231/228, t. 1, k. 31.

[6] AIPN, sygn. 00231/228, t. 1, k. 31.

[7] AIPN, sygn. 00231/228, t. 13, k. 468.

падку гаворка ішла, пераважна, пра прадстаўнікоў інтэлігенцыі.

Да 1947 г. удзел польскіх службаў бяспекі ў змаганні з „беларускімі нацыяналістамі" быў нязначны, бо ў гэны час асноўную пагрозу для камуністычнай улады стварала польскае незалежніцкае ўзброенае падполле. Толькі напрыканцы 1940-х гадоў МГБ распачало шырокамаштабную кампанію па выяўленні і распрацоўцы асяродкаў „беларускіх нацыяналістаў" у краіне і на Захадзе. У 1949 г. у складзе I аддзела I дэпартамента МГБ быў створаны спецыяльны рэферат па справах нацыянальных меншасцей, які павінен быў займацца распрацоўкай асоб, што супрацоўнічалі падчас акупацыі з нямецкімі ўладамі[8]. Сваёй дзейнасцю ён ахапіў сотні жыхароў Польшчы — былых сяброў беларускіх арганізацый, створаных у перыяд акупацыі. У поле зроку „ўбэкаў" трапілі, сярод іншага, былыя сябры беларускіх камітэтаў, якія дзейнічалі на тэрыторыі Польшчы ў гады вайны[9]. Пад кантроль былі таксама ўзяты тыя, хто падтрымліваў якія-небудзь адносіны з „беларускімі нацыяналістамі", якія пражывалі ў СССР. З гэтай мэтай былі заведзены агентурныя справы пад умоўнымі назвамі „Нацыяналісты" і „N-2"[10]. Увагу МГБ прыцягвалі і тыя, хто меў на Захадзе сваякоў, якія часова выязджалі ў Польшчу дзеля адведзін.

У шматлікіх рапартах і справаздачах МГБ асяроддзе „беларускіх нацыяналістаў" характарызавалася наступным чынам: „Сярод старых нацыяналістычных дзеячаў, якія жывуць у краіне, заўважана самастойнае распачынанне варожай нацыяналістычнай дзейнасці сярод уласнага асяроддзя, збіранне інфармацыі ў час знаходжання на тэрыторыі Савецкага Саюза, шуканне кантактаў з асобамі на эміграцыі, якім перадаюць інфармацыю адносна настрояў паасобных груп насельніцтва і інфармацыі з тэрыторыі СССР"[11]. У адным з рапартаў МГБ за 1951 г. чытаем наступнае: „Было вызначана, што беларускія нацыяналісты не спынілі сваёй варожай дзейнасці, а па-ранейшаму ставяцца варожа ў дачыненні да цяперашняга дзяржаўнага ладу ў краіне, а таксама ў СССР, што выяў-

[8] AIPN, sygn. 00231/228, t. 228, t. 8, k. 167-169.

[9] Першы беларускі камітэт на тэрыторыі Генеральнага Губернатарства з'явіўся ў Варшаве ў 1940 г. на чале з інжынерам Мікалаем Шчорсам і меў свае экспазітуры ў Белай-Падляшскай і Кракаве. Па загадзе нямецкае вайсковае выведкі сябры гэтага камітэта шукалі сярод беларускіх эмігрантаў кандыдатаў у дыверсійныя школы дзеля далейшага закіду іх у СССР. На тэрыторыі Польшчы, якая была далучана да III Рэйха, дзейнічалі экспазітуры Беларускага камітэта самапомачы ў Берліне. Такія экспазітуры існавалі ў Лодзі, Познані, Быдгашчы. Апрача таго, у Торуні, Познані і Гдыні дзейнічалі ўпаўнаважаныя Беларускага прадстаўніцтва. Незалежна ад згаданых арганізацый існаваў Беларускі каміэтэт (аб'яднанне) у Беластоку.

[10] AIPN, sygn. 00231/228, t. 15, k. 120.

[11] AIPN, sygn. 00231/228, t. 15, k. 120.

ляецца ў іх у выглядзе ціхай прапаганды”[12].

Належыць, аднак, аспрэчыць вышэйзгаданае меркаванне. У сапраўднасці пераважная большасць былых беларускіх актывістаў намагалася рабіць усё, каб не выклікаць свайго „дэмаскавання” ў грамадстве. Асабліва гэта тычылася былых паліцыянтаў і палітычных дзеячаў. У сваёй масе гэта быў элемент, які падчас нямецкай акупацыі заангажаваўся ў дзейнасць цывільнай адміністрацыі альбо вайскова-паліцыйных фармаванняў, створаных немцамі. Як вынікае з дакументаў, некаторыя з іх пасля вайны нават уступілі ў ПАРП. Перадусім, гэты крок належыць тлумачыць імкненнем замаскавацца ў грамадстве, каб не было нават ценю сумневу ў іх крышталічным мінулым. Насуперак меркаванням МГБ, большасць гэных беларусаў не займалася падпольнай антыдзяржаўнай дзейнасцю. Знаходжанне ў Польшчы не было бяспечным. Дзеля пэўнасці патрэбна было змяніць прозвішча і заканспіравацца ў невялікім населеным пункце. Пасля пераезду ў Польшчу большасць згаданых беларусаў былі вымушаны ў асабовых дакументах падаваць польскую нацыянальнасць, бо ў выніку выкрыцця многім пагражала дэпартацыя ў СССР[13]. Большасць грамадзян, якіх служба бяспекі класіфікавала як „беларускіх нацыяналістаў”, пражывалі ў Беластоцкім ваяводстве, а таксама на Вернутых землях. Аналіз архіўных дакументаў дазваляе зрабіць кароткі агляд дадзенай катэгорыі асоб у залежнасці ад месца пражывання на 1952 г.

У Шчэцінскім ваяводстве былі зафіксаваны 29 беларусаў, якія падчас нямецкай акупацыі ўдзельнічалі ў беларускім руху на Наваградчыне. Супраць іх мясцовыя „ўбэкі” распачалі агентурна-падрыхтоўчыя распрацоўкі „Студэнт” і „Арэк”[14].

У Гданьскім ваяводстве мясцовыя органы бяспекі налічылі 33 асобы беларускай нацыянальнасці, якія супрацоўнічалі з немцамі ў перыяд вайны. У іх асяроддзе былі накіраваны 3 інфарматары. Мясцовыя ўлады асцерагаліся, што варожа настроеныя да камуністычнага ладу беларусы могуць стаць зручным элементам дзеля іх выкарыстання выведкамі замежных краін. Неўзабаве ў адным з рапартаў прайшла інфармацыя пра тое, што на тэрыторыі ваяводства пражывалі сваякі Барыса Рагулі. Ваяводская ўправа грамадскай бяспекі (ВУГБ) у Гданьску інфармавала кіраўніцтва ў Варшаве: „У час капітуляцыі Нямеччыны тэрыторыя Гданьскага ваяводства ператварылася ў транзітны канал для разнастайных прафашысцкіх элементаў, якія скампраметавалі сябе злачыннай дзейнасцю на тэрыторыі СССР і Польшчы ды шукалі

[12] AIPN, sygn. 00231/228, t. 1, k. 17.
[13] AIPN, sygn. 00231/228, t. 14, k. 96.
[14] AIPN, sygn. 00231/228, t. 3, k. 135.

магчымых шляхоў паратунку на Захадзе, пад апекай капіталістычных дзяржаў, разлічваючы на магчымасць продажу сваіх паслуг у сферы шпіёнскай працы. У выніку працы па вывучэнні гэтага элемента ў нашым ваяводстве і высвятленні яго варожай дзейнасці на падставе аналітычнага матэрыялу трэба адзначыць, што беларускія нацыяналісты не спынілі сваёй шпіёнскай дзейнасці, а толькі змянілі сваіх апекуноў"[15]. Пасля шэрагу распрацовак былі вылучаны тры месцы, у якіх гуртаваліся „беларускія нацыяналісты": 1) Лембаркскі павет (група былых жаўнераў Беларускай краёвай абароны), 2) Гданьск і Сопат (група былых чальцоў беларускага камітэта)[16] і 3) Эльблангскі і Гданьскі паветы (група былых сяброў Беларускай народнай самапомачы)[17].

На тэрыторыі Ольштынскага ваяводства на ўлік службаў бяспекі былі ўзяты 32 чалавекі, якія супрацоўнічалі з немцамі (1941-1944 гг.). У гэтым асяроддзі працавалі чатыры канфідэнты МГБ. У службовай нататцы ВУГБ у Ольштыне адзначалася: „некаторыя па-ранейшаму займаюцца варожай дзейнасцю на тутэйшым абшары праз распаўсюджванне варожай прапаганды пра трэцюю сусветную вайну, кляймуюць СССР і варожа выступаюць супраць калектывізацыі на вёсцы (...). Больш таго, яны ўтрымліваюць паміж сабой кантакты, а дзеля лепшай легалізацыі ў грамадстве ўступаюць у партыю, дзе атрымліваюць магчымасць ажыццяўлення варожай працы. Гэты элемент з'яўляецца добрай асновай для выкарыстання яго варожымі чыннікамі і цалкам можа быць выкарыстаны заходнім нацыяналізмам у выведвальных мэтах"[18].

На тэрыторыі Вроцлаўскага ваяводства былі выяўлены 54 беларусы з „нацыяналістычнымі" поглядамі, сярод якіх знаходзіліся два агенты МГБ. Адным з галоўных фігурантаў, якія праходзілі па дакументацыі службаў бяспекі, быў Баляслаў Гапановіч (Бабрыка), які ў гады вайны служыў у Польскіх узброеных сілах на Захадзе. Мясцовыя ўлады пачалі сачыць за ім пасля таго, калі высветлілі, што ён лістуецца з былым саслужыўцам — Вінцэнтам Жук-Грышкевічам, кіраўніком Згуртавання беларусаў у Вялікабрытаніі.

Захаваліся шматлікія рапарты МГБ, якія ўтрымліваюць звесткі пра асяроддзе т.зв. „беларускіх нацыяналістаў" на тэрыторыі Зялёнагурскага ваяводства. З гадавой справаздачы за 1951 г. вынікае, што „на тэрыторыі Зялёнагурскага ваяводства пражываюць нацыяналістычныя беларускія элементы з Беларускай народнай самапомачы, Самааховы, Саюза беларускай моладзі, паліцыі (...), якія ад страху перад адказнас-

[15] AIPN, sygn. 00231/228, t. 3, k. 133.
[16] Праўдападобна гаворка ідзе адносна экспазітуры Беларускага прадстаўніцтва ў Гдыні.
[17] AIPN, sygn. 00231/228, t. 3, k. 133.
[18] AIPN, sygn. 00231/228, t. 3, k. 21.

цю за здзейсненыя злачынствы хаваюцца пад чужымі прозвішчамі. Збольшага гэныя асобы працуюць на ўласных гаспадарках, але частка з іх займае адказныя пасады ў дзяржаўным апараце, прамысловасці і судзе, дзе, як элемент цалкам варожы ў дачыненні да цяперашняга ладу і непрыхільна настроены ў дачыненні да СССР, можа быць выкарыстаны выведкамі капіталістычных дзяржаў. (...) Фігуранты, якія былі выкрыты ў перыяд распрацоўкі, перапісваюцца з асобамі, якія знаходзяцца ў капіталістычных дзяржавах і якіх яны ведаюць яшчэ з часоў нямецкай акупацыі. Сярод апошніх сустракаюцца заангажаваныя ў дзейнасць беларускіх цэнтраў на чужыне, якімі кіруе капіталістычная выведка. На тэрыторыі Зялёнагурскага ваяводства яны (беларускія нацыяналісты — Ю. Г.) утрымліваюць кантакты ў шчыльным коле сваіх сваякоў альбо добрых знаёмых, звязаных з імі дзейнасцю ў перыяд акупацыі. (...) Акрамя таго, усе яны падтрымліваюць ліставанне са знаёмымі ім асобамі альбо чальцамі сваіх сем'яў у капіталістычных краінах, ад якіх шматразова атрымліваюць пасылкі"[19].

У Быдгашчскім ваяводстве ў поле зроку мясцовых функцыянераў МГБ трапілі 30 беларусаў, сярод якіх былі завербаваныя тры інфарматары. Пэўную частку фігурантаў складалі былыя сябры Беларускага камітэта ў Торуні. У рапартах мясцовых „убэкаў" чытаем: „Гэты элемент у дадзены момант займаецца варожай дзейнасцю ў выглядзе ладжання сходак, слухання радыёстанцый з капіталістычных краін, а таксама правядзення паміж сабою размоў наконт маючай распачацца трэцяй сусветнай вайны, у выніку якой СССР і краіны народнай дэмакратыі атрымаюць паразу"[20]. ВУГБ у Быдгашчы пачала супраць „беларускіх нацыяналістаў" распрацоўку „Эмігрант"[21]. У выніку ўлады натрапілі на след 10 асоб, якія належалі ў гады акупацыі да Беларускай народнай самапомачы ў Баранавіцкай акрузе. Сярод асоб, якія найчасцей фігуравалі ў рапартах мясцовых функцыянераў службы бяспекі, знаходзілася Юзэфа Альхоўская, былая старшыня Беларускага камітэта ў Быдгашчы, якая 5 кастрычніка 1949 г. была арыштавана[22].

На тэрыторыі Лодзінскага ваяводства былі выкрыты 20 грамадзян беларускай нацыянальнасці, сярод якіх толькі дзве асобы зацікавілі МГБ, і супраць іх былі заведзены агентурныя справы[23].

У Кашалінскім ваяводстве пад наглядам службы бяспекі апынуліся 6 „беларускіх нацыяналістаў", якія паходзілі з міжваеннага Косаўскага павета. Некаторыя з іх пасля пераезду ў Польшчу ўладкаваліся на пра-

[19] AIPN, sygn. 00231/228, t. 1, k. 21
[20] AIPN, sygn. 00231/228, t. 2, k. 158.
[21] AIPN, sygn. 00231/228, t. 2, k. 149.
[22] AIPN, sygn. 00231/228, t. 4, k. 150.
[23] AIPN, sygn. 00231/228, t. 25, k. 103.

цу ў дзяржаўным апараце. У службовай нататцы адзначалася: „Беручы пад увагу мінулае гэтага элемента, а таксама ягонае знаходжанне ў сучасны момант ва ўстановах дзяржапарату і шырокія кантакты, няма ніякага сумневу, што ён на дадзеным этапе можа быць выкарыстаны імперыялістычнымі выведкамі з мэтай ажыццяўлення дыверсійна-шпіёнскай працы на шкоду дзяржаўнага ладу ПНР і СССР”[24].

У лідэры па колькасці выяўленых „беларускіх нацыяналістаў” уваходзіла Варшаўскае ваяводства. У 1952 г. на яго тэрыторыі налічваліся 46 асоб беларускай нацыянальнасці, якія кваліфікаваліся МГБ як „нацыяналістычны элемент”. Варта адзначыць, што яны былі расцярушаны па тэрыторыі ўсяго ваяводства. Іх прысутнасць была выяўлена ў 12 паветах, перш за ўсё ў ваколіцах Седльцаў і Астралэнкі. Парадаксальна, але беларускае асяроддзе на тэрыторыі Варшаўскага ваяводства было ці не найгорш распрацаваным службамі бяспекі ПНР. Некалькі чалавек працавалі ў дзяржаўным апараце і кааператывах, у той час як большасць жылі ў сельскай мясцовасці. У Седлецкім павеце ў 1950 г. мясцовыя функцыянеры ВУГБ правялі мэтавую распрацоўку „Беларусы” з удзелам канфідэнта „Мушыньскага”.

На тэрыторыі Кракаўскага ваяводства пражывалі толькі 15 асоб беларускай нацыянальнасці, да якіх былі засланы два інфарматары „Коля” і „Рыс”, якія ў мінулым былі жаўнерамі 65-га паліцыйнага батальёна ў Наваградку.

У Катавіцкім ваяводстве фігуравалі 11 беларусаў, сярод якіх мясцовыя „ўбэкі” не заўважалі праяваў „антыкамуністычнай альбо нацыяналістычнай дзейнасці”.

На тэрыторыі Келецкага ваяводства МГБ узяло пад кантроль шэсць беларусаў, у дачыненні толькі аднаго з якіх мелася інфармацыя пра ягонае „варожае стаўленне” да камуністычнай рэчаіснасці.

У Жэшаўскім ваяводстве мясцовыя функцыянеры службы бяспекі ў 1952 г. інфармавалі пра чатырох жыхароў беларускай нацыянальнасці, у тым ліку двух былых афіцэраў і двух шараговых беларускіх паліцыйных ахоўных батальёнаў.

ВУГБ у Познані да 1952 г. не праводзіла ніякіх мерапрыемстваў па збіранні звестак пра колькасць і дзейнасць „беларускіх нацыяналістаў” на тэрыторыі гэтага ваяводства[25]. Пазней, аднак, высветлілася, што на тамтэйшым абшары пражывалі чатырнаццаць вышэйзгаданых асоб. Гэта былі сябры БНС на Наваградчыне і некалькі жаўнераў БКА, у тым ліку адзін афіцэр. Адзін з рапартаў ВУГБ за 1952 г. паведамляў у Варшаву: „Аналізуючы дзейнасць беларускай арганізацыі, належыць мер-

[24] AIPN, sygn. 00231/228, t. 3, k. 76.
[25] AIPN, sygn. 00231/228, t. 25, k. 98-104.

каваць, што гэты элемент па прычыне свайго мінулага складае базу, на якую можа разлічваць замежная выведка (...). У сувязі з гэтым магчыма дапусціць, што асобныя людзі, калі не цяпер, то ў будучыні могуць быць выкарыстаны для правядзення шпіёнскай працы на карысць імперыялістычнай выведкі"[26]. Дзеля распрацоўкі дадзенага асяроддзя былі завербаваныя наступныя агенты: „Юрэк", „Бароўскі" і „Чарнэцкі". Трэба адзначыць, што ў лік асоб, якія трапілі пад пільнае вока „ўбэкаў" і якія пражывалі ў Познаньскім ваяводстве, апынуліся беларусы, якія ў гады нямецкай акупацыі займалі даволі высокія пасады. Да іх належалі, сярод іншых: Адам Таранда, намеснік бурмістра Баранавічаў, а пасля начальнік цывільнай адміністрацыі Новамышскага раёна; Лявон Глінскі, камандзір 35 батальёна БКА; Барыс Рамановіч, упаўнаважаны Беларускага прадстаўніцтва ў Кёнігсбергу; Адам Дэмідовіч-Дэмідэцкі, намеснік бурмістра Менска[27].

Асаблівай увагі заслугоўвае разгляд справы т.зв. „беларускіх нацыяналістаў" на тэрыторыі Беластоцкага ваяводства. Найбольшую зацікаўленасць мясцовых функцыянераў службы бяспекі выклікалі былыя сябры Беларускага камітэта ў Беластоку, а таксама жаўнеры беларускага батальёна, якія дзейнічалі падчас нямецкай акупацыі[28]. Са статыстыкі МГБ вынікала, што ў гады акупацыі на Беласточчыне да вышэйзгаданых беларускіх арганізацый належала 609 чалавек, у тым ліку ў Беластоку — 313, Саколцы — 62, гміне Белавежа — 84, гміне Нарва — 64, гміне Гайнаўка — 85 чалавек. У пасляваенныя гады польскія службы бяспекі знайшлі 34 былых актывістаў Беларускага камітэта. У 1952 г. у спісе былых сяброў камітэта, якія фігуравалі ва „ўбэцкай" дакументацыі, месціліся 153 асобы, у тым ліку 10 жаўнераў беларускага батальёна. МГБ здолела завербаваць у якасці інфарматараў восем былых камітэтчыкаў. З пункту гледжання службаў бяспекі ПНР яны былі найбольш падатнымі для „нацыяналістычна-выведніцкай дзейнасці". У сувязі з гэтым было вырашана на тэрыторыі паветаў Гай-

[26] AIPN, sygn. 00231/228, t. 3, k. 78.

[27] AIPN, sygn. 00231/228, t. 18, k. 20.

[28] Беларускі камітэт у Беластоку ўтварыўся ў 1941 г. і ажыццяўляў сваю дзейнасць на наступных напрамках: культурніцка-асветны, апека над беларускім насельніцтвам, фармаванне беларускіх фармаванняў, пашырэнне беларускага школьніцтва. На чале камітэта ў розны час знаходзіліся: Хведар Ільяшэвіч, Чэслаў Ханяўка, Канстанцін Габінскі, Уладзімір Тамашчык. У траўні 1943 г. высілкамі чальцоў камітэта быў сфармаваны беларускі батальён пад камандаваннем капітана/маёра Івана Гелды. Асабовы склад гэтага фармавання налічваў каля 120 чалавек. Камандны склад выглядаў наступным чынам: 1 звяз — Уладыслаў Асецімскі, 2 звяз — Мікалай Грыцук і Яўфім Данілюк, 3 звяз — Уладыслаў Васілюк і Ян Аўдзейчык. Батальён браў удзел у барацьбе з савецкай партызанкай.

наўка, Беласток, Саколка і Дамброва арганізаваць контрвыведніцкую працу з мэтай „вывуджвання" жыхароў гэнага рэгіёна, якія разглядаліся службамі бяспекі ў якасці патэнцыйных агентаў замежных выведак. Мэтай акцыі было завядзенне адпаведных аператыўных справаў на асоб, якія падазраваліся ў „варожай дзейнасці і былі найбольш схільнымі да варожай дзейнасці". У той жа самы час іх, як асоб, якія „мелі станоўчыя рысы дзеля магчымасці ўсталявання кантактаў з нацыяналістычнай эміграцыяй і карысталіся даверам у варожым нацыяналістычным асяроддзі", належала распрацоўваць на прадмет магчымасці іх аператыўнага выкарыстання[29].

Інфармацыйная нататка рэферэнта I аддзела МГБ ад 21 ліпеня 1953 г. выклікала сур'ёзны непакой у ВУГБ у Беластоку. Як вынікала з гэнага дакумента, у апараце грамадскай бяспекі ў Беластоцкім ваяводстве працавалі больш за 10 былых сяброў Беларускага камітэта і беларускага батальёна. Некаторыя з іх у 1944 г. эвакуаваліся з нямецкімі войскамі на Захад, адкуль у першыя пасляваенныя гады вярнуліся ў якасці рэпатрыянтаў, а потым пасяліліся на паўночных і заходніх землях Польшчы. Частка зрабіла кар'еру ў дзяржаўных установах, як напрыклад, у Міністэрстве вернутых зямель, Дзяржаўнай рэпатрыяцыйнай управе, а таксама ў Міністэрстве грамадскай бяспекі. У якасці прыкладу можна падаць факт, што былая сяброўка Беларускага камітэта ў Беластоку пасля вайны ўладкавалася на працу сакратаркай у ВУГБ у Беластоку, а адзін з былых сяброў згаданага камітэта працаваў на адказнай пасадзе ў Павятовай управе публічнай бяспекі ў Алецку Ольштынскага ваяводства[30].

З канца 1950-х гг. МГБ пачало шэраг распрацовак сярод былых камітэтчыкаў. 27 траўня 1949 г. яны пачалі аб'ектавую распрацоўку „Лука", якая тычылася сяброў камітэта ў павеце Бельск-Падляшскі. Праз распрацоўку праходзілі 20 фігурантаў і 8 інфарматараў. 9 чэрвеня 1949 г. пачалася аб'ектавая распрацоўка сяброў камітэта ў Саколцы, якая ахоплівала 8 фігурантаў. 25 чэрвеня 1949 г. службы бяспекі перайшлі да аб'ектавай распрацоўкі „Санак" у дачыненні да сяброў камітэта, якія пражывалі на тэрыторыі Беластоцкага павета (7 фігурантаў). 1 лютага 1951 г. была пачата наступная распрацоўка былых сяброў Беларускага камітэта, якая ахапіла 11 фігурантаў. У гэтай распрацоўцы ўзялі ўдзел агенты „Сасна" і „Сыч"[31]. 20 красавіка 1951 г. ВУГБ у Беластоку перайшла да ажыццяўлення маштабнай распрацоўкі былых камітэтчыкаў. У гэтую справу былі заангажаваны агенты „Сыч", „Акторка", „Ру-

[29] AIPN, sygn. 00231/228, t. 15, k. 122.
[30] AIPN, sygn. 00231/228, t. 15, k. 122.
[31] AIPN, sygn. 00231/228, t. 17, k. 20.

жыта". У спісе асоб, якія вышукваліся польскай службай бяспекі, апынуўся таксама адзін з былых кіраўнікоў камітэта — Канстанцін Габінскі. Існавала падазрэнне, што Габінскі хаваўся ад улад у Гдыні альбо ў Гнезне, бо ягоная жонка (жыла ў Алецку) часта туды выязджала. 16 студзеня 1951 г. стаў днём пачатку аб'ектавай распрацоўкі „Рус", мэтай якой было выяўленне былых сяброў беларускага батальёна. У часе распрацоўкі беларускага актыву на Беласточчыне падчас нямецкай акупацыі выкарыстоўваліся інфарматары з ліку былых сяброў Беларускага аб'яднання ў Беластоку. Напрыклад, падчас згаданай аперацыі „Рус" службы бяспекі выкарыстоўвалі інфарматара „Дуба", былога актыўнага сябра Беларускага камітэта ў Беластоку[32]. Падчас выкрыцця былых беларускіх актывістаў на Беласточчыне выкарыстоўваўся, таксама, канфідэнт „Літоўскі" (завербаваны 6 красавіка 1945 г.), які быў чальцом Беларускага камітэта ў Беластоку, тым часам, як яго блізкі сваяк з'яўляўся камандзірам беларускага батальёна[33].

Пасля Другой сусветнай вайны частка былых сяброў Беларускага камітэта на Беласточчыне апынулася ў ЗША, Францыі, Бельгіі, Вялікабрытаніі, Заходняй Нямеччыне, Швецыі. У сувязі са сваёй актыўнай дзейнасцю ў перыяд нямецкай акупацыі ўвагу УБ прыцягвалі такія камітэтчыкі, як Васіль Лукашык, Кастусь Кіслы, Яўген Явец, Яўген Ніканюк, Мікалай Жукаў. Службы бяспекі ПНР лічылі, што гэтыя эмігранты будуць намагацца ўсталяваць сувязь з былымі сябрамі камітэта ў Польшчы з мэтай стварэння агентурна-выведвальнай сеткі на тэрыторыі Беластоцкага ваяводства. Беручы пад увагу геаграфічнае становішча і блізкасць да мяжы з СССР, Беласточчына магла стаць пераходнай базай і месцам перакідвання агентаў заходніх выведак. З мэтай высвятлення магчымых кантактаў жыхароў ваяводства з некаторымі беларускімі эмігрантамі былі заведзены агентурныя справы „Нацыяналісты" і „Нацыяналісты-2"[34].

Безумоўна, у поле зроку службаў бяспекі перш за ўсё траплялі асобы, якія былі заўважаны ў супрацоўніцтве з немцамі ў перыяд акупацыі. Дзеля гэтага ахвярамі пераследу часта былі свядомыя беларусы, якія супрацоўнічалі з нямецкімі ўладамі па палітычных прычынах. Належыць, аднак, прызнаць, што ў асобных выпадках распрацоўка беларускага асяроддзя дапамагла пошуку і пакаранню ваенных злачынцаў, якія ў гады нямецкай акупацыі бралі ўдзел у масавым знішчэнні цывільнага насельніцтва. У значнай ступені гэта датычыла былых жаўнераў беларускіх паліцыйных фармаванняў, якія пасля вайны аселі

[32] AIPN, sygn. 00231/228, t. 4, k. 18.
[33] AIPN, sygn. 00231/228, t. 22, k. 74.
[34] AIPN, sygn. 00231/228, t. 15, k. 120.

ў Польшчы. У 1950-х гг. па ПНР пракацілася хваля гучных працэсаў над функцыянерамі 13-га беларускага батальёна СД[35]. 28 лютага 1956 г. у Вроцлаве быў арыштаваны былы каментант Калдычаўскага канцэнтрацыйнага лагера Сяргей Бобка, які хаваўся ў Польшчы пад прозвішчам Стэфан Букоўскі. Разам з Бобкам на лаве падсудных апынуліся ягоныя падуладныя паплечнікі з ліку падафіцэраў батальёна — Аляксандр Вяронік (арыштаваны ў Сакольскім павеце 15 верасня 1956 г.) і Аляксандр Леўш (Юзаф Сухоцкі), які жыў у Ольштынскім ваяводстве. 2 снежня 1957 г. ваяводскі суд у Вроцлаве прызнаў вышэйзгаданых асоб вінаватымі ва ўдзеле ў масавых забойствах і прысудзіў усіх да смяротнага пакарання[36]. Пазней, аднак, Найвышэйшы суд 27 сакавіка 1958 г. змяніў смяротны прысуд на розныя тэрміны пазбаўлення волі: Бобку — на пажыццёвае зняволенне, Вяроніку — на 15 гадоў вязніцы, Леўшу — на 10. 7 траўня 1959 г. Найвышэйшы суд адхіліў папярэдні прысуд і засудзіў на смерць Бобку. У траўні 1959 г. Дзяржаўная рада скарысталася правам на памілаванне і асудзіла яго на пажыццёвае зняволенне. Канчатковая кропка ў справе Бобкі была пастаўленая 17 сакавіка 1970 г., калі Ваяводскі суд у Вроцлаве змяніў гэты прысуд на 25 гадоў пазбаўлення волі. У гэты час адбылося яшчэ некалькі судовых працэсаў над былымі жаўнерамі 13-га батальёна, якія здзейснілі злачынствы падчас нямецкай акупацыі. Так, напрыклад, 7 снежня 1949 г. Ваяводскім судом у Вроцлаве быў асуджаны на смерць былы функцыянер СД Віктар Дыра[37]. Некалькі былых жаўнераў 13-га батальёна, якія ўваходзілі ў склад варты Калдычаўскага лагера, былі асуджаны ў Беластоку, Вроцлаве, Лодзі і Катавіцах[38]. Да ліку найбольш гучных спраў належаў працэс над Мікалаем Глобам (Эўгеніюш Владарчык), у дачыненні да якога 2 снежня 1947 г. Ваяводскі суд у Лодзі вынес смяротны прысуд[39]. Яшчэ адзін карнік, Аляксандр Сенька (Уладзіслаў Верцішкевіч), 29 кастрычніка 1949 г. у Катавіцах быў прысуджаны да вышэйшай меры пакарання[40].

[35] Фармаванне батальёна пачалося ў лютым 1943 г. у Менску. У яго складзе служылі рэкруты з Бабруйскага, Берасцейскага, Маладзечанскага, Полацкага, Вілейскага і Баранавіцкага раёнаў. Батальён быў узброены згодна са стандартамі нямецкіх фармаванняў СС. Фармаванне складалася з сямі ротаў і налічвала звыш тысячы жаўнераў. Акрамя таго, існавала вучэбная рота. Адзінкі батальёна кватараваліся ў розны час у Менску, Вілейцы, Баранавічах. Жаўнеры 13-га батальёна СД выкарыстоўваліся немцамі ў антыпартызанскіх і карных акцыях, у тым ліку ў знішчэннях гетаў.

[36] Archiwum Głównej Komisji Badań Zbrodni Hitlerowskiej w Polsce (dalej: AGKBZHwP), sygn. SWWr, t. 112, k. 353-356.

[37] AGKBZHwP, sygn. SWWr, t. 104, k. 94.

[38] AGKBZHwP, sygn. SWWr, t. 103-112; SWKt, t. 18; SOB, t. 216.

[39] AGKBZHwP, sygn. SWWr, t. 104, k. 50.

[40] AGKBZHwP, sygn. SWWr, t. 99, k. 996.

Судовыя працэсы датычылі не толькі жаўнераў 13-га батальёна СД, але таксама і функцыянераў беларускай паліцыі парадку. У якасці прыкладу можа паслужыць былы начальнік беларускай паліцыі ў Ганцавічах Яўстах Філіповіч, які за здзейсненыя злачынствы ў перыяд нямецкай акупацыі ў траўні 1954 г. быў пакараны смерцю ў Зялёнай Гуры[41]. У далейшыя гады польскія і савецкія службы бяспекі працягвалі пошук ваенных злачынцаў на тэрыторыі Польшчы. На працягу 1964-1965 гг. на падставе матэрыялаў, атрыманых ад савецкіх службаў бяспекі, 7 асоб былі асуджаны на тэрміны ад 8 да 15 гадоў. У дачыненні да трох арыштаваных быў вынесены смяротны прысуд. Апрача таго, яшчэ 10 асоб знаходзіліся пад следствам і чакалі вырашэння свайго лёсу[42].

У 1952 г. кіраўніцтва МГБ ахарактарызавала стан распрацавання т.зв. „беларускіх нацыяналістаў" як вельмі неэфектыўны і слаба разгорнуты, аб чым сведчыла недастатковая лічба агентаў сярод гэтай катэгорыі грамадзян. У сувязі з гэтым было прынята рашэнне ўзмацніць працу ў накірунку распрацавання асяроддзя „беларускіх нацыяналістаў" і высветліць наяўнасць кантактаў з паплечнікамі на Захадзе[43]. З мэтай зрабіць немагчымым „правядзенне беларускімі нацыяналістычнымі элементамі варожай працы" было вырашана распачаць агентурны нагляд ужо вядомых „беларускіх нацыяналістаў", якія пражывалі ў ПНР[44].

Супраць т.зв. „беларускіх нацыяналістаў" польскія службы бяспекі праводзілі шырокамаштабныя распрацаванні як „Дыверсант", „Б-І", „Б-ІІ", „Б-ІІІ", „Цэнтро" і іншыя. 1 снежня 1949 г. распачалося аб'ектавае распрацаванне „Дыверсант", праз якое праходзіла агулам 110 фігурантаў. 16 лютага 1951 г. польскія спецслужбы распачалі чарговае распрацаванне, мэтай якога была распрацоўка польскіх грамадзян беларускай нацыянальнасці, якія ў гады нямецкай акупацыі былі сябрамі Саюза беларускай моладзі (СБМ), Беларускай краёвай абароны (БКА), Беларускага корпусу самааховы (БСА) і беларускіх вайскова-паліцыйных фармаванняў СС і СД. 1 верасня 1953 г. УБ пачало рэалізоўваць распрацаванне „Б-ІІ", якое тычылася асоб, што ў перыяд з 1941 па 1944 г. ангажаваліся ў беларускую дзейнасць на абшары Баранавіцкай акругі. У полі зроку спецслужбаў ПНР апынуліся 52 асобы, якія пражывалі ў Польшчы, Заходняй Нямеччыне і ЗША, у тым ліку 22 былыя сябры БНС, 1 былы сябра СБМ, 5 былых вайскоўцаў БКА, 7 былых паліцыянтаў і яшчэ 17 асоб, акрэсленых назвай „супрацоўнікі з гітлераўцамі"[45]. Сярод асоб, якія фігуравалі ў дадзеным распрацаванні знаходзі-

[41] AIPN, sygn. 00231/228, t. 2, k. 279.
[42] AIPN, sygn. 00231/228, t. 37, k. 117.
[43] AIPN, sygn. 00231/228, t. 25, k. 104-105.
[44] AIPN, sygn. 00231/228, t. 5, k. 1.
[45] AIPN, sygn. 00231/228, t. 25, k. 42.

ліся: Франц Кушаль, Юры Сабалеўскі, Іван Калоша, Аляксандр Крыт, Тацяна Валасовіч і іншыя. Аб'ектавае распрацаванне „Б-II" у першай фазе ажыццяўлення мела на мэце: 1) выявіць усіх „беларускіх нацыяналістаў", якія пражывалі ў Польшчы, а да 1944 г. дзейнічалі на тэрыторыі Баранавіцкай акругі; 2) выявіць асоб, якія мелі лучнасць з „беларускімі нацыяналістамі" ў Заходняй Нямеччыне; 3) вызначыць і апрацаваць сярод „беларускіх нацыяналістаў" кандыдатаў на завербаванне[46]. З цягам часу кола фігурантаў „Б-II" павялічвалася і ў хуткім часе ў яго лік трапілі: Людвіг Зарэчны, Уладзімір Сенька, Сяргей Шчэрба, якія жылі на Захадзе і былі актыўнымі дзеячамі арганізацыі Беларускі вызвольны рух (БВР)[47].

На ўвагу заслугоўвае, таксама, распрацаванне „Б-I", якое мела падобныя мэты, аднак тычылася беларускага актыву з Навагрудчыны, які пасля вайны пасяліўся ў Польшчы. Праз гэта распрацаванне праходзіла агулам 96 фігурантаў, у тым ліку 29 грамадзян Польшчы. У ліку апошніх знаходзілася 7 былых сяброў БНС, 1 былы сябра СБМ, 2 былыя жаўнеры БКА, 1 былы супрацоўнік СД, 15 былых паліцыянтаў і 3 „супольнікі гітлераўскай улады". На думку спецслужбаў астатнія фігуранты таксама пражывалі ў Польшчы, аднак месца іх жыхарства заставалася невызначаным. Сярод іх былі былыя дзеячы БНС (8 чал.), СБМ (3), паліцыянты (46) і супрацоўнікі цывільнай адміністрацыі (6). З моманту пачатку распрацавання „Б-I" у спісе асоб, якія вышукваліся МГБ знаходзіліся былыя актывісты БНС на Навагрудчыне: Аляксандр Яскевіч, Мікалай Булак, Барыс Куніцкі, Васіль Рамановіч[48].

У лістападзе 1952 г. распачалося маштабнае распрацаванне „Дыверсант", якое было разлічана на „выяўленне варожай дзейнасці, праводзімай беларускімі нацыяналістамі". Галоўным чынам гэта аперацыя спецслужбаў ПНР была скіравана супраць былых беларускіх паліцыянтаў і сяброў БНС. На тэрыторыі Быдгашчскага ваяводства ў гэту акцыю было заангажаваных шэсць інфарматараў. Першапачаткова вынікі былі аднак сціплыя, паколькі сярод 50 асоб, якія знаходзіліся ў вышуку, спецслужбам атрымалася трапіць на след толькі 15. Гэта былі былыя чальцы БНС, якія паходзілі з Баранавічаў, Дзятлава і Навагрудка. У Лодзінскім ваяводстве аперацыя „Дыверсант" праводзілася супраць былых сяброў Беларускага камітэта ў Лодзі. У выніку допытаў затрыманых фігурантаў УБ выявіла 33 асобы, якія належалі да гэнага камітэта. 25 студзеня 1954 г. у межах аперацыі „Дыверсант" пачалося распрацаванне былых паліцыянтаў з мясцовасці Дзятлава. На чэрвень

[46] AIPN, sygn. 00231/228, t. 25, k. 44.
[47] AIPN, sygn. 00231/228, t. 25, k. 37.
[48] AIPN, sygn. 00231/228, t. 5, k. 1-2.

1954 г. вышэйзгаданыя распрацаванні ахоплівалі 241 асобу, у тым ліку: „Дыверсант" — 95, „Б-I" — 94, „Б-II" — 52 чал.[49]

Акрамя таго, на абшары асобных ваяводстваў секцыя I аддзела II дэпартамента III МГБ ажыццяўляла распрацаванне былых жаўнераў спецыяльнага парашутнага батальёна „Дальвіц"[50]. У выніку на 1952 г. па гэтай справе было арыштавана 14 былых камандасаў, у тым ліку 12 былі асуджаны на розныя тэрміны зняволення[51]. Спецслужбам удалося інфільтраваць у асяроддзе былых парашутыстаў некалькі сваіх агентаў. Напрыклад, інфарматар „Каліноўскі" ў гады вайны ў годнасці капітана служыў у спецыяльным батальёне „Дальвіц". Пасля вайны быў завербаваны УБ пад пагрозай прыцягнення да крымінальнай адказнасці ў выпадку адмовы ад супрацоўніцтва з уладамі ў справе распрацавання іншых „беларускіх нацыяналістаў"[52]. Завербаваныя ПУГБ у Зялёнай Гуры агенты „112" і „В-105" таксама мелі за плячыма службу ў спецыяльным батальёне „Дальвіц". Да 1957 г. у ПНР было арыштавана звыш ста былых выпускнікоў дыверсійна-выведных школаў, створаных у гады вайны Абверам[53]. Магчыма меркаваць, што пэўную частку з іх складалі менавіта былыя парашутысты батальёна „Дальвіц". Вядома, што яшчэ ў 1956 г. у СССР і ПНР вышукваліся некаторыя былыя камандасы з „Дальвіца". У іх ліку знаходзілася Тамара Чарамшагіна, былая радыстка батальёна, закінутая ў групе дыверсантаў у снежні 1944 г. на тэрыторыю БССР[54].

20 жніўня 1955 г. польскія спецслужбы распачалі агентурнае распрацаванне „Б-III". Мэтай аперацыі было выяўленне і перахоп магчымых каналаў сувязі паміж беларускімі эміграцыйнымі цэнтрамі і т.зв. „беларускімі нацыяналістамі" ў ПНР і СССР. У часе аперацыі асаблівая ўвага звярталася на беларускіх палітычных дзеячаў на эміграцыі, а таксама іх блізкіх сваякоў у Польшчы. Сапраўды, у паваенныя гады ў Польшчу пераехалі сваякі Радаслава Астроўскага, прэзідэнта Бела-

[49] AIPN, sygn. 00231/228, t. 25, k. 119.

[50] Спецыяльны батальён „Дальвіц" быў створаны ў жніўні 1944 г. ва Усходняй Прусіі. Колькасны стан складаў каля двухсот чалавек. Крыніцай рэкрутацыі былі беларускія паліцыянты і ўдзельнікі палітычных, маладзёвых і вайскова-паліцыйных арганізацый (БКА, БНС, СБМ, Беларуская незалежніцкая партыя). Галоўным заданнем батальёна была падрыхтоўка дыверсантаў дзеля далейшага перакіду на заплечча Чырвонай Арміі з мэтай ажыццяўлення партызанскай барацьбы. У лістападзе-снежні 1944 г. адбылася серыя закідаў паветраным шляхам паасобных груп камандасаў. У траўні 1945 г. асабовы склад фармавання быў раззброены чэшскімі партызанамі на нямецка-чэшскім памежжы.

[51] AIPN, sygn. 00231/228, t. 25, k. 104

[52] AIPN, sygn. 00231/228, t. 4, k. 11.

[53] AIPN, sygn. 00231/228, t. 20, k. 316.

[54] AIPN, sygn. 00231/16, k. 29.

рускай цэнтральнай рады (БЦР), а таксама іншых яго чынных паплечнікаў — Міколы Шчорса, Імануіла Ясюка і іншых. Яны жылі ў Вроцлаве, Познані, Ольштыне, Быдгашчы. Падчас распрацавання „Б-III" УБ зрабіла спробу выкарыстання кампраматных звестак супраць Радаслава Астроўскага. Справа тычылася дакументаў II аддзела Генеральнага штаба Войска Польскага ў 1920-я гг., якія пацвярджалі факт яго супрацоўніцтва з гэтай установай. У распрацаванні „Б-III" бралі ўдзел, між іншым, канфідэнты „Садоўскі", „Марыя", „Баёўнік", якія павінны былі высветліць „варожую дзейнасць" Шчорса на чужыне, а таксама сабраць інфармацыю наконт магчымасці ўсталявання з ім лучнасці праз сваякоў і знаёмых у Польшчы[55].

З натуральнай прычыны справа распрацавання спецслужбамі ПНР „беларускага нацыяналістычнага элемента" ў Польшчы была неад'емна звязаная са спробамі распрацавання беларускай паваеннай эміграцыі ў заходніх краінах. Як вядома, у першыя пасляваенныя гады на Захадзе існавалі досыць шматлікія асяродкі беларускіх эмігрантаў. Варта прыгадаць, што беларускую палітычную эміграцыю ў сваёй большасці складалі эмігранты з ваеннай хвалі, якія пакінулі бацькаўшчыну ў 1944 г. пад наступам савецкіх войскаў. Разам з адыходзячымі нямецкімі войскамі тады эвакуавалася звыш 50 тыс. чалавек[56]. Да гэтай лічбы варта дадаць пэўную колькасць беларусаў з Польскіх узброеных сілаў на Захадзе, а таксама прымусова выгнаных на працу ў III Рэйх, якія пасля заканчэння баявых дзеянняў не пажадалі вяртацца ў СССР.

У палітычным сэнсе беларуская эміграцыя была падзелена на прыхільнікаў Рады Беларускай Народнай Рэспублікі (БНР) і Беларускай цэнтральнай рады (БЦР). Абодва лагеры мелі сваіх прыхільнікаў ва ўсіх краінах свету, дзе пасля вайны былі парасцярушаны беларусы — у Вялікабрытаніі, Францыі, Бельгіі, Заходняй Нямеччыне, ЗША, Канадзе, Аўстраліі і інш. У гэтых краінах дзейнічалі грамадска-палітычныя, культурніцкія і ветэранскія арганізацыі[57].

Беларуская палітычная эміграцыя стала аб'ектам увагі спецслужбаў ПНР. Так, 26 верасня 1955 г. V аддзел II дэпартамента Камітэта па справах грамадскай бяспекі заклаў агентурна-гуртовую справу „Б-I", якая была разлічана на распрацаванне асоб, звязаных з Радай БНР на чужыне на чале з інж. Міколам Абрамчыкам. Якім чынам Рада БНР выглядала ў вачах польскіх службаў бяспекі? Трэба адзначыць, што апошнія

[55] AIPN, sygn. 00231/228, t. 24, k. 34-39.

[56] У гэту лічбу ўваходзіла 16 тыс. жаўнераў і афіцэраў вайсковых і вайскова-паліцыйных фармаванняў і 34 тыс. цывільных асоб, перадусім чальцоў іх сем'яў.

[57] Instytut Polski i Muzeum im. gen. Sikorskiego (dalej: IPMS), *Ref. „Naczelne organizacje polityczne wśród emigracji z krajów Środkowo-Wschodniej Europy"*, sygn. A.11.E.873.

мелі досыць прымітыўнае ўяўленне пра беларускую палітычную рэпрэзентацыю на Захадзе. Сведчыць пра гэта наступны рапарт Міністэрства ўнутраных спраў (МУС) за 1956 г.: „Галоўнай мэтай БНР, якая дзейнічае за плячыма выведкі Задзіночаных Штатаў і ў пэўнай ступені Францыі, ёсць ажыццяўленне шпіёнскай, дыверсійнай і варожай нацыяналістычнай дзейнасці супраць Польшчы і краін народнай дэмакратыі, у першую чаргу супраць СССР. БНР займаецца шкаленнем вайсковых кадраў, якія павінны будуць выступіць на баку альянтаў і адарваць БССР ад Савецкага Саюза і на гэных тэрыторыях стварыць буржуазную дзяржаву”[58]. Асноўнай крыніцай інфармацыі на гэты конт былі зводкі з КДБ БССР, якія дасылаліся ў выпадку патрэбы супольнае распрацоўкі. У полі зроку аперацыі „Б-І” апынуліся беларускія дзеячы на эміграцыі: Мікола Абрамчык, Барыс Рагуля, Пятро Сыч, Вінцэнт Жук-Грышкевіч, а. Леў Гарошка, Аляксандр Лашук, Янка Станкевіч і шэраг іншых. Акцыя „Б-І” прадугледжвала ўвядзенне ўласнага агента ў асяроддзе беларускіх эмігрантаў. Аднымі з першых шнупараў, накіраваных з заданнем за мяжу былі „Місь” і „Альгерд”. У 1956 г. разважалася пытанне выслання ў якасці турыстаў на Захад некалькіх агентаў-беларусаў. З гэтай мэтай меркавалася наладзіць сувязь з Васілём Лукашыкам, які быў прадстаўніком газеты „Бацькаўшчына” ў Швецыі. Акрамя таго, праз польскіх сваякоў і знаёмых рабіліся спробы ўсталяваць кантакт з сакратаром Згуртавання беларусаў у Вялікабрытаніі (ЗБВБ) Аляксандрам Лашуком, Уладзімірам Бортнікам — старшынём Беларускага камітэта ў Мюнхене і Уладзімірам Бутрымовічам — беларускім дзеячам у Бельгіі[59]. У аперацыі па інфільтрацыі агентуры ў шэрагі беларускіх эмігрантаў актыўна выкарыстоўваўся інфарматар „Баёўнік”, які ў 1951-1956 гг. адбыў некалькі падарожжаў у Заходнюю Нямеччыну. „Баёўнік” быў адным з былых кіраўнікоў Беларускага камітэта ў Генеральным Губернатарстве, таму добра ведаў шэраг беларускіх эмігрантаў[60]. У часе сваіх паездак ён сустракаўся з прадстаўнікамі як беларускай эміграцыі, гэтак і амерыканскай і французскай выведак. „Баёўнік” усталяваў асабісты кантакт з прэзідэнтамі абодвух плыняў беларускай эміграцыі Міколам Абрамчыкам і Радаславам Астроўскім, а таксама ачольнікам Беларускага вызвольнага руху (БВР) Людвігам Галубовічам (Зарэчным) і кіраўніком беларускай службы Радыё „Вольная Еўропа” Пятром Сычом[61]. З заданнем наладжання сувязі з беларускім асяродкам на брытанскіх выспах у верасні-кастрычніку 1960 г. у Лондан да беларускага грэка-каталіцкага свя-

[58] AIPN, sygn. 00231/228, t. 24, k. 262.
[59] AIPN, sygn. 00231/228, t. 24, k. 265-266.
[60] AIPN, sygn. 00231/228, t. 5, k. 97.
[61] AIPN, sygn. 00231/228, t. 5, k. 97.

тара Чэслава Сіповіча быў высланы агент „Нагурны". У хуткім часе „Нагурны" выйшаў на прэзідэнта БНР Міколу Абрамчыка, з якім распачаў ліставанне. Іншы шнупар „Віцебскі" па загадзе спецслужбаў ПНР усталяваў кантакт з вышэйзгаданым Лашуком, ад якога нават атрымаў запрашэнне наведаць Англію. МУС ПНР разлічвала на тое, што пасля спаткання „Віцебскага" з Васілём Лукашыкам са Швецыі і кіраўніцтвам ЗБВБ будзе магчыма адсочваць падрабязную інфармацыю адносна „варожай" чыннасці беларускіх калоній у Вялікабрытаніі і Швецыі[62]. Да Лукашыка з тым жа заданнем ездзіў таксама агент „Вальдэк"[63]. Яшчэ адзін шнупар „Яблонская" ў 1955 г. была дэлегавана ў Францыю з заданнем распрацавання дзеяча беларускай эміграцыі Сяргея Шчэрбы[64]. З дапамогай агента „Яскоўскага" службы бяспекі ПНР планавалі завербаваць беларускага дзеяча ў Аўстраліі Міхася Зуя[65].

У распрацаванні беларускай эміграцыі меркавалася выкарыстаць іх родных і знаёмых, якія жылі ў Польшчы. Напрыклад, у ПНР пасля вайны пражывалі родныя і сваякі Міколы Шчорса — кіраўніка Беларускага камітэта ў Генеральным Губернатарстве; Чэслава Сіповіча — беларускага святара ў Лондане; Францішка Кушаля — кіраўніка беларускага ветэранскага руху на чужыне; Генрыка Барановіча — беларускага дзеяча ў Канадзе; Дзмітрыя Касмовіча — ачольніка арганізацыі Беларускі вызвольны фронт і шмат іншых. Службы бяспекі ПНР рабілі спробы распрацавання гэтых грамадзян з мэтай завербавання і выкарыстання ў справе ўсталявання праз іх кантактаў з актыўнымі беларускімі эмігрантамі.

Ці сапраўды беларускія эмігранты былі ў стане пагражаць бяспецы камуністычных улад Польшчы? На пераломе 1940-1950-х гг. беларуская палітычная эміграцыя жыла надзеяй, што ў найбліжэйшым часе распачнецца трэцяя сусветная вайна паміж Захадам і сацыялістычным лагерам. Эмігранты разлічвалі на тое, што з гэтай вайны СССР выйдзе пераможаным, у выніку беларуская праблема будзе вырашана заходнімі хаўруснікамі. Незалежна ад розніцы ў палітычных поглядах абодва лагеры ў рознай ступені супрацоўнічалі з выведкамі заходніх дзяржаў. Вядома, што некаторыя эмігранты займаліся пошукам добраахвотнікаў да амерыканскіх і брытанскіх веведных школаў. Напрыклад, ад Рады БНР падрыхтоўкай кандыдатаў займаўся Барыс Рагуля, які супрацоўнічаў з выведкай ЗША. Апрача таго, з брытанскімі спецслужбамі ўтрымлівала кантакт арганізацыя Беларускі вызвольны рух (БВР). Пасля праходжання курсу падрыхтоўкі кандыдатаў меркавалася за-

[62] AIPN, sygn. 00231/228, t. 31, k. 1.
[63] AIPN, sygn. 00231/228, t. 14, k. 69.
[64] AIPN, sygn. 00231/228, t. 25, k. 37.
[65] AIPN, sygn. 00231/228, t. 20, k. 320.

кідваць у Беларусь з заданнем стварэння антысавецкай канспіратыўнай сеткі і правядзення выведнай працы. Падрыхтоўка адбывалася ў адмысловых цэнтрах на тэрыторыі Бельгіі і Заходняй Нямеччыны. Вядома, што з дапамогай амерыканскай выведкі былі здзейсненыя два дэсанты (верасень 1951 г. і жнівень 1952 г.), калі ў БССР было закінута пяць эмісараў Рады БНР[66].

Беручы пад увагу геаграфічнае становішча Польшчы, гэта краіна ў пэўнай ступені зацікавіла беларускіх эмігрантаў, якія супрацоўнічалі з заходнімі выведкамі. Галоўным чынам ПНР разглядалася як абшар наладжання каналаў перакіду людзей і перадачы звестак з БССР на Захад і наадварот. Зараз належыць адказаць на пытанне: ці гэтыя планы ў рэчаіснасці былі зрэалізаваныя? У архівах службаў бяспекі ПНР знаходзяцца пэўныя ўзгадкі на гэты конт. Напрыклад, яшчэ ў лютым 1948 г. МГБ мела інфармацыю, што ў амерыканскай зоне акупацыі Нямеччыны адбывалася падрыхтоўка да закіду праз тэрыторыю Польшчы ў БССР двух беларусаў-агентаў амерыканскай выведкі Андрэя Дуды і нейкага Садоўскага, мэтай якіх было ўсталяванне лучнасці з «бандамі „Арла" і „Вітушкі"»[67]. Згодна з інфармацыяй, якая мелася ў польскіх спецслужбаў, акцыя перакіду згаданых агентаў была запланавана на люты 1948 г.[68]

У 1952 г. арганізацыя Беларускі вызвольны рух, якая карысталася падтрымкай брытанскай выведкі, накіравала ў Польшчу двух сваіх эмісараў — Вацлава (Васіля) Завадскага[69] і Аляксандра Петраша[70]. Пасля праходжання трохмесячнага шкалення на базе пад Лонданам яны былі скіраваны ў Дзюсельдарф, адкуль перакінуты ў Заходні Берлін. 8 траўня 1952 г. Завадскі і Петраш з дапамогай мясцовага праваднікa-немца перакрочылі нямецка-польскую мяжу. Падчас знаходжання ў ГДР яны

[66] *Антысавецкія рухі ў Беларусі. Даведнік,* рэд.: А. Дзярновіч, Менск 1999, с. 154-155, 167-169.

[67] Гаворка ідзе адносна беларускіх антысавецкіх партызанскіх аддзелаў. Рэч у тым, што ў той час сярод эмігрантаў панавала перакананне, што на бацькаўшчыне дзейнічае добра заканспіраванае і арганізаванае ўзброенае падполле ў выглядзе арганізацыі „Чорны кот" на чале з Міхалам Вітушкам. AIPN, sygn. 00231/228, t. 5, k. 78.

[68] AIPN, sygn. 00231/228, t. 5, k. 78.

[69] Вацлаў (Васіль) Завадскі, сын Янкі і Сафіі, нар. 22 ліпеня 1916 г. у в. Любішчыцы (Косаўскі павет). Падчас нямецкай акупацыі быў начальнікам пастарунка паліцыі ў Ляхавічах, потым у Косаве. У 1944 г. трапіў у Нямеччыну, адкуль пазней эміграваў у Вялікабрытанію.

[70] Аляксандр Петраш, сын Янкі і Ганны, нар. 6 верасня 1926 г. у в. Кісялі (Баранавіцкі павет). У 1944 г. уступіў у беларускую паліцыю. Служыў у 30 грэнадзёрскай дывізіі СС (расейская н-р 2) і ў ейным складзе змагаўся ў Францыі. Трапіў у палон да альянтаў. У 1945 г. добраахвотнікам уступіў у Польскія ўзброеныя сілы на Захадзе. З 1946 г. жыў у Вялікабрытаніі.

карысталіся фальшывымі нямецкімі дакументамі, тым часам як у Польшчы мелі адпаведныя польскія дакументы (Петраш на прозвішча Уладыслава Пятроўскага, а Завадскі — Яна Яворскага і Антонія Лянгэ). Заданнем агентаў было: 1) стварэнне агентурнай сеткі на базе былых прыхільнікаў БЦР і прэзідэнта Астроўскага; 2) запачаткаванне каналаў перакіду ў СССР; 3) вызначэнне магчымасці перасякання мяжы з СССР. У хуткім часе пасля таго, як яны апынуліся ў ПНР, Петраш быў затрыманы МГБ. У выніку праведзенай перавярбоўкі ён атрымаў псеўданім „Станіслаў" і быў вызвалены пад наглядам. Яшчэ ў траўні 1952 г. пасля спаткання з Завадскім у Быдгашчскім ваяводстве яму атрымалася вымкнуцца з-пад кантролю УБ. 11 ліпеня 1952 г. абодва ўдала ўцяклі ў Нямеччыну. Ці ўдалося эмісарам БВР хоць часткова выканаць заданне? Паколькі Петраш практычна з першых дзён быў „абясшкоджаны" польскімі спецслужбамі ніжэй варта спыніцца на дзейнасці Завадскага ў перыяд знаходжання ў Польшчы. У выдадзеным у 1964 г. дзеля службовага ўжытку супрацоўнікаў МУС ПНР даведніку *Informator o nielegalnych antypaństwowych organizacjach i bandach zbrojnych działających w Polsce Ludowej w latach 1944-1956* ёсць узгадка пра маладзёвую арганізацыю „Беларускія нацыяналісты", якая нібыта дзейнічала ў Быдгашчы, Варшаве і Лодзі. Заслугоўвае на ўвагу тое, што сярод кіраўнікоў узгадваецца Ян Яворскі-Завадскі[71]. У рэчаіснасці аднак не была гэта арганізацыя. Праўдападобна, гаворка ідзе пра кола людзей, з якімі Завадскаму ўдалося сустрэцца і, прынамсі з часткай, падзяліцца сваімі планамі. Не выключана, што некаторым Завадскі зрабіў прапанову спрычыніцца да дзейнасці па стварэнні канспіратыўнай сеткі. На працягу 1952-1954 гг. МГБ арыштавала 13 асоб, з якімі Завадскі паспеў усталяваць непасрэдны альбо ўскосны кантакт. Сярод затрыманых апынулася таксама жонка Завадскага — Кацярына Завадская, якая падчас следства засведчыла, што нібы была агентам брытанскай выведкі[72]. У хуткім часе гэта справа была скіравана ў архіў, паколькі не адшукалася істотных доказаў існавання падпольнай структуры з удзелам згаданых асоб. Спецслужбы аднак не жадалі пакінуць у спакоі самога Завадскага, спадзяючыся перавербаваць яго і выкарыстоўваць у сваіх мэтах. Дзеля гэтага „ўбэкі" рашыліся на непасрэдны шантаж. Так, у Польшчы жылі жонка і дачка Завадскага. Першая была арыштавана, тым часам як другая ў 1955 г. была змушана да супрацоўніцтва пад псеўданімам „Марыся". З мэтай схі-

[71] *Informator o nielegalnych antypaństwowych organizacjach i bandach zbrojnych działających w Polsce Ludowej w latach 1944-1956,* Warszawa 1964 [Lublin 1993], s. 181.

[72] У ліку арыштаваных апынуліся, між іншым: Дзяніс Зыбайла, Ганна Бурдын, Вольга Мікарэвіч, Людміла Заявённа, Стэфан Бахур, Вацлаў Дойняк, Віктар Шчэрба. AIPN, sygn. 00231/228, t. 16, k. 192.

лення Завадскага да супрацоўніцтва „Марыся” была выслана ў Англію ў адведзіны да бацькі. Адначасна перад ёй была пастаўлена задача вывучэння асяроддзя беларускіх эмігрантаў на брытанскіх выспах. Завадскаму прапаноўвалася сустрэцца з прадстаўнікамі польскіх спецслужбаў ва Усходнім Берліне. Трэба адзначыць, што „Марыся” пагадзілася паехаць у Англію пры ўмове, што ў выпадку перавярбоўкі бацька не будзе арыштаваны[73]. У рэчаіснасці аднак планы „ўбэкаў” скончыліся паразай. У кастрычніку 1960 г. „Марыся” паведаміла МУС пра спыненне супрацоўніцтва і выказала намер застацца ў Англіі. У хуткім часе яна выйшла замуж за эмігранта Уладыслава Сыча і ў снежні 1960 г. атрымала дазвол на сталае знаходжанне ў Вялікабрытаніі[74].

На жаль, архіўныя дакументы не ўтрымліваюць іншай інфармацыі адносна магчымых падобных спробаў у далейшым запачаткаваць беларускую канспіратыўную сетку на тэрыторыі ПНР. Варта ўзгадаць, што згодна са звесткамі польскіх службаў бяспекі ў 1956 г. пад фальшывым прозвішчам ПНР наведаў Міхась Зуй, які меўся вывучыць магчымасці стварэння падпольнае сеткі сярод сваіх знаёмых і паплечнікаў у Польшчы[75]. Няма аднак больш падрабязных звестак на гэты конт, што не дазваляе альбо адрынуць, альбо пацвердзіць дадзенай інфармацыі. Належыць толькі дадаць, што з пачаткам змякчэння напружанасці паміж Захадам і СССР на пераломе 1950-1960-х гг. акцыі заходніх выведак, накіраваныя на стварэнне і падтрымку канспірацыі ў краінах сацыялістычнага лагера з дапамогай беларускіх цэнтраў на чужыне выглядаюць мала верагоднымі.

Да дыскусійных праблемаў належыць таксама пытанне адносна існавання беларускага ўзброенага падполля ці незалежніцкай партызанкі на тэрыторыі Польшчы ў першыя пасляваенныя гады. Да нашых дзён гэта праблема абрасла разнастайнымі версіямі, легендамі і міфамі. У беларускай эміграцыйнай літаратуры, і не толькі, магчыма натрапіць на звесткі пра досыць актыўную дзейнасць беларускіх партызан ва ўсходняй Польшчы. Пераважна гаворка ідзе наконт Беластоцкага ваяводства. Прыхільнікі гэтай версіі даводзяць, што тамтэйшая беларуская партызанка існавала прынамсі да сярэдзіны 1950-х гг. Найчасцей сярод аддзелаў і падпольных структур узгадваюцца групы антысавецкай партызанскай арганізацыі „Чорны кот”, галоўны штаб якой нібы месціўся ў ваколіцах Варшавы. Акрамя таго, у эміграцыйнай літаратуры магчыма сустрэцца з узгадкамі адносна баявой дзейнасці на Беласточчыне аддзелаў беларускіх атаманаў Якуба Харэўскага і Івана Пе-

[73] AIPN, sygn. 00231/228, t. 30, k. 48.
[74] AIPN, sygn. 00231/228, t. 31, k. 48.
[75] AIPN, sygn. 00231/228, t. 14, k. 67.

рагуда. Згодна з успамінамі былых удзельнікаў, якія належалі да згаданых аддзелаў, дзейнасць беларускіх партызанаў у асноўным заключалася на змаганні з раскватаравамымі тут адзінкамі савецкіх войскаў, а таксама ахове мясцовага беларускага насельніцтва ад нападаў з боку польскага ўзброенага падполля шляхам аказання дапамогі ў стварэнні аддзелаў самааховы і правядзенні баявых акцый супраць польскіх партызанаў[76]. Тым часам, багатая дакументацыя МГБ-МУС Польшчы, якая тычыцца дзейнасці „беларускіх нацыяналістаў", не ўтрымлівае інфармацыі, якая б пацвярджала існаванне ў пасляваенныя гады якіх-колечы беларускіх партызанскіх аддзелаў. З аналізу аператыўных дакументаў МГБ вынікае, што прынамсі да 1952 г. у Польшчы не было заўважана праяваў беларускага ўзброенага супраціву[77]. Больш таго, магчыма натрапіць на інфармацыю, якая сцвярджае цалкам адваротнае. У прыватнасці, у шматлікіх рапартах МГБ сустракаюцца звесткі, накшталт: „у першыя пасляваенныя гады, калі ўкраінскія, літоўскія і польскія нацыяналісты ў вялікім маштабе арганізавалі палітычнае і ўзброенае падполле, то сярод беларусаў не ўзнікла ніводная арганізацыя такога тыпу"[78]. Дзейнасць беларускага ўзброенага падполля ў Польшчы не пацвярджаецца таксама і шматлікімі дакументамі польскага падполля на Беласточчыне, з якім, як сцвярджаюць беларускія эміграцыйныя крыніцы, беларусы ўтрымлівалі сувязь і нават часамі ажыццяўлялі супольныя акцыі. Дзеля параўнання варта прыгадаць, што існуе масіў дакументальнай інфармацыі адносна актыўнасці ў пасляваенныя гады ўкраінскага ўзброенага падполля ў Польшчы[79]. Такім чынам, няма архіўных падставаў, каб пагадзіцца з меркаваннем, што на тэрыторыі Польшчы ў пасляваенныя гады існаваў беларускі антысавецкі ўзброены супраціў.

Заслугоўвае ўвагі яшчэ адзін цікавы факт. У беларускай літаратуры, прысвечанай антысавецкаму ўзброенаму супраціву, магчыма сустрэць узгадку пра дзейнасць на тэрыторыі Польшчы аддзела беларускіх партызанаў, якія былі пад камандаваннем лейтэнанта Антона Бандыка. Гэта былі былыя жаўнеры 13-га беларускага батальёна СД. Дадзенаму аддзелу прыпісваецца выкананне ў перыяд са жніўня 1944 па жнівень 1945 г. звыш 70 удалых баявых акцый супраць савецкіх войскаў[80]. Варта аднак зазначыць, што пацвярджэнне гэтаму адсутнічае як у дакументах польскіх камуністычных улад і савецкіх вайсковых

[76] С. Ёрш, С. Горбік, *Беларускі супраціў*, Львоў 2006, с. 240-248.
[77] AIPN, sygn. 00231/228, t. 25, k. 104.
[78] AIPN, sygn. 00231/228, t. 20, k. 316.
[79] G. Motyka, *Ukraińska partyzantka 1942-1960. Działalność Organizacji Ukraińskich Nacjonalistów i Ukraińskiej Powstańczej Armii*, Warszawa 2006, s. 557-591.
[80] С. Ёрш, С. Горбік, *Беларускі супраціў*, с. 198.

ды цывільных экспазітур, так і ў крыніцах польскага незалежніцкага падполля. Тым часам, нельга адмаўляць самаго факту прысутнасці вайскоўцаў са згаданага батальёна на тэрыторыі Польшчы ў той час. Архіўныя дакументы дазваляюць сцвердзіць знаходжанне беларускіх жаўнераў у шэрагах мясцовай польскай партызанкі. Вядома, што ў ліпені 1944 г. у Аўгустоўскай пушчы на бок 1-га палка ўланаў крэхавецкіх Арміі Краёвай перайшла адна з ротаў 13-га беларускага батальёна СД. Праўдападобна, гаворка сапраўды ідзе пра роту пад камандаваннем згаданага вышэй лейтэнанта Бандыка. У складзе гэтага фармавання знаходзіліся 4 афіцэры, 19 падафіцэраў і 90 шараговых. Беларуская рота была перафармаваная, а асабовы склад размеркаваны па польскіх аддзелах. Значная частка (60 чал.) была аб'яднана ў аддзел „Шчапа", які ўзяў чынны ўдзел у аперацыі „Бужа" на Аўгустоўшчыне. Пасля правядзення гэтай акцыі асобовы склад быў дэмабілізаваны[81]. Вышэйзгаданы выпадак пераходу беларускіх жаўнераў да польскай партызанкі ў гэным рэгіёне не быў адзінкавым. У ліпені-жніўні 1944 г. паасобныя групы дэзерціраў з 13-га батальёна далучаліся да польскіх партызанаў на тэрыторыі Аўгустоўшчыны. Складана прасачыць далейшы лёс гэтых жаўнераў. Архіўныя крыніцы дазваляюць сцвердзіць, што некаторыя з іх уступілі ў постакоўскія аддзелы (напрыклад, аддзел „Аса"), у складзе якіх знаходзіліся яшчэ ў 1946 г.[82] У 1949-1965 гг. многія з іх за службу ў пранямецкіх вайсковых фармаваннях былі асуджаны камуністычнымі ўладамі Польшчы на розныя тэрміны пазбаўлення волі. Некаторыя намагаліся падкрэсліць факт знаходжання ў польскім падполлі, разлічваючы, што гэта спрычыніцца да змякчэння пакарання. Напрыклад, у сакавіку 1970 г. Міхась Сарока пісаў у Бюро паміловаванняў пры Дзяржаўнай радзе: „Польшчы я ніколі не здраджваў. Пры першае нагодзе ў ліпені 1944 года з кагалам сяброў у колькасці васьмі чалавек дэзэртаваў з 13-га батальёна і добраахвотна далучыўся да шэрагаў Арміі Краёвай, да аддзела „Аса", у складзе якога змагаўся за Польшчу. Пасля паразы Варшаўскага паўстання наш аддзел быў расфармаваны (...). Я перакананы, што сваёй дзейнасцю і супрацоўніцтвам з рухам супраціву ў асобе АК цалкам рэабілітаваўся за службу ў калабаранцкім фармаванні"[83]. Няма аднак інфармацыі адносна ўдзелу былых жаўнераў 13-га батальёна ў стварэнні і дзейнасці беларускіх партызанскіх аддзелаў.

Парадаксальна, але спробы стварэння разгалінаванага беларускага падполля ў Польшчы сапраўды былі зроблены, але яны належалі спец-

[81] A. Suchcitz, *Dzieje 1 Pułku Ułanów Krechowieckich 1941-1947*, Londyn 2002, s. 297.
[82] AGKBZH w P, sygn. SWWr 99, k. 638-640, 858.
[83] AGKBZH w P, sygn. SWWr 99, k. 638-640.

службам ПНР. Адна са спробаў была звязана з аперацыяй „Цэнтро” (Centro). Па загадзе МГБ у кастрычніку 1953 г. вышэйзгаданы канфідэнт „Баёўнік” падчас сваіх візітаў у Заходнюю Нямеччыну навязаў лучнасць з прадстаўнікамі амерыканскай выведкі і запрапанаваў ім запачаткаванне ў Польшчы добра заканспіраванай арганізацыі, якая мела б на мэце правядзенне выведна-інфармацыйнай акцыі, сабатажу і дыверсіі. Пасля перамогі над камунізмам і вызвалення Беларусі ў выніку мяркуемай трэцяй сусветнай вайны сябры канспірацыі павінны былі скласці стрыжань дзяржаўнай адміністрацыі. Адным з ключавых элементаў чыннасці падпольнай сеткі мела быць арганізацыя пунктаў перакіду кур’ераў з ГДР у СССР і наадварот, а таксама стварэнне дапаможных базаў дзеля аказання дапамогі закінутым асобам. План прадугледжваў, што беларуская сетка будзе злучана з адпаведнай польскай канспірацыяй. Асабовы склад падполля мусіў быць мяшаны: большасць складалі беларусы, але дазвалялася прымаць і палякаў. З цягам часу беларусаў належала амаль цалкам перакінуць на Беларусь, пакідаючы ў Польшчы толькі нязначны адсотак[84].

Арганізацыя павінна была абапірацца на сістэму „троек”. Непасрэдным кіраўніком сеткі павінен быць рэзідэнт у краіне, у лік абавязкаў якога ўваходзіла: вярбоўка сяброў канспірацыі, абсада кіраўнічых пасад на ўзроўні акругаў і размежаванне іх абавязкаў, арганізацыя працы кур’ераў і пунктаў перакіду, кантраляванне дзейнасці падполля, збор вайсковай і эканамічнай інфармацыі, стасункі з польскім падполлем. Сетка павінна была дзяліцца на наступныя аддзелы: 1) дакументацыі і перакіду (DiP), 2) сувязі, 3) бяспекі. У склад DiP уваходзілі: секцыя дакументацыі, кур’ерская служба, служба перакіду. Гэты аддзел быў адказны за стварэнне пунктаў перакіду (па два каля ўсходняй і заходняй мяжы), прыняцце кур’ераў з-за мяжы і арганізацыя іх бяспечнага пераходу праз тэрыторыю Польшчы (у тым ліку забеспячэнне іх грашовымі сродкамі, неабходнымі дакументамі і адзеннем). Тым часам, шэфу аддзела бяспекі падлягалі: контрвыведка, экзекутыва і выкананне выракаў. Галоўны пункт прыёму кур’ераў мусіў знаходзіцца ў Белавежы. Увогуле перакід кур’ераў мог ажыццяўляцца па пяці трасах, якую абірала кіраўніцтва базы, на якую прыбываў кур’ер. Кур’ера належала праводзіць на адлегласць 20 км ад памежнай базы, пасля чаго ён мог працягваць вандроўку самастойна. Шэф аддзела сувязі мусіў адказваць за кантакт з падполлем на Беларусі і ўзгадняць з ім перакід кур’ераў[85].

Акрамя вышэйзгаданай структуры існавалі яшчэ дзве самастойныя секцыі: E — эканамічная выведка і W — вайсковая выведка. Пры гэ-

[84] AIPN, sygn. 00231/228, t. 20, k. 116.
[85] AIPN, sygn. 00231/228, t. 20, k. 122.

тых секцыях прадугледжвалася стварэнне аддзела палітычна-сацыяльнай выведкі, задачай якой было вывучэнне настрояў насельніцтва.

На патрэбы функцыянавання сеткі належала вербаваць інфарматараў МГБ. Сістэма вербавання сяброў павінна была заключацца на пошуку асоб сярод „беларускіх нацыяналістаў", якія мелі асабістыя крыўды на камуністычны рэжым, а таксама асоб, якія прагнулі палепшыць уласны дабрабыт. Неўзабаве, функцыянаванне канспірацыі вымагала значных грашовых выдаткаў. Ганарар для шэраговых сяброў мусіў складаць ад 1 500 да 3 500 злотых штомесячна ў залежнасці ад характару працы. На выпадак арышту альбо смерці агента падчас выканання сваіх абавязкаў яго родным належалася кампенсацыя ў памеры ад 500 да 15 000 долараў ЗША. Грашовыя сумы павінны былі дастаўляць з-за мяжы кур'еры. Кожны прыняты сябра арганізацыі мусіў прайсці пяцімесячны курс шкалення, які складаўся з прынцыпаў бяспекі, вывучэння спосабаў збору і верыфікацыі інфармацыі, складання данясенняў, сродкаў канспіравання, правядзення акцый сабатажу і малой дыверсіі[86].

Беларуская падпольная сетка павінна была мець свае экспазітуры на наступным абшары: Варшава, Вроцлаў, Лодзь, Шчэцін, Гданьск, Вейхерова, Легніца, Ольштын, Гожуў, Беласток, Сувалкі і шэраг драбнейшых пунктаў. Дзеля распачынання дзейнасці неабходна было 750 000 злотых.

Вышэйзгаданы план, апрацаваны МГБ, быў прапанаваны нібы „ад імя беларускіх нацыяналістаў у Польшчы" найперш выведцы ЗША, а потым Францыі. Высілкі „ўбэкаў" былі аднак марнымі, паколькі пасля прааналізавання гэтага плана з Вашынгтона быў атрыманы адмоўны адказ. Не надалі гэтаму плану належнай увагі і французы[87].

У жніўні 1952 г. III дэпартамент МГБ апрацаваў чарговы план агентурна-аперацыйных мерапрыемстваў, якія мелі на мэце арганізацыю на тэрыторыі Польшчы каналаў перакіду замежных кур'ераў. Такім чынам спецслужбы ПНР спадзяваліся наладзіць працэс цалкам падкантрольнага сабе перакіду агентаў амерыканскай выведкі. Апошніх меркавалася вербаваць сярод „беларускіх буржуазных нацыяналістаў". Праўдападобна, нагодай дзеля апрацавання гэтага плана быў нядаўны закід Завадскага і Петраша, паколькі польскія службы бяспекі спадзяваліся, што выпадкі гэткага кшталту будуць у будучыні паўтарацца. План заключаўся на стварэнні каля заходняй мяжы Польшчы 2 альбо 3 пунктаў дзеля прыёму амерыканскіх шнупараў і далейшага іх скіравання ў патрэбным для службаў бяспекі напрамку па створаным канале. Дзеля ажыццяўлення гэтае акцыі планавалася выкарыстаць аген-

[86] AIPN, sygn. 00231/228, t. 20, k. 115-127.
[87] AIPN, sygn. 00231/228, t. 20, k. 115-127.

таў „Анджэя” і „Ванду” з Зялёнай Гуры, а таксама „Лідзію” і „24” са Шчэцінскага ваяводства. У Варшаве мелі быць створаны дзве канспіратыўныя яўкі як прамежкавыя базы. Планам прадугледжвалася таксама выкарыстанне 2-3 агентаў каля ўсходняй мяжы ў ваколіцах Ольштына, Беластока і Белавежы дзеля перахопу агентаў амерыканскай выведкі, якія накіроўваліся альбо вярталіся з СССР. Аднак і гэты план ніколі не быў рэалізаваны, паколькі заходнія выведкі „не спакусіліся” на гэтую задуму[88].

Такім чынам, спробы спецслужбаў ПНР па стварэнні штучнай беларускай канспіратыўнай сеткі ў Польшчы дзеля выкарыстання ў шпіёнскіх гульнях з выведкамі заходніх краін, перадусім ЗША, скончыліся паразай.

З цягам часу справа т.зв. „беларускіх нацыяналістаў у краіне і іх палітычных цэнтраў на Захадзе” адыходзіла на задні план, што, перадусім, вынікала з рахманага стаўлення польскіх беларусаў. Несумненна, спрычынілася да гэтага і міжнародная сітуацыя. Былыя беларускія дзеячы, якія ў гады вайны супрацоўнічалі з нямецкімі ўладамі, намагаліся не вылучацца ў грамадскім і палітычным жыцці, каб не выклікаць дэмаскавання свайго мінулага. Адначасна сярод беларусаў было заўважана пачуццё роспачы, паколькі яны ўжо не мелі магчымасці паўплываць на змену існуючага дзяржаўнага ладу на радзіме. У сваю чаргу беларуская эміграцыя, таксама, не мела практычнай магчымасці значна ўплываць на суродзічаў у ПНР. Штораз больш цьмяна выглядала верагоднасць трэцяй сусветнай вайны. У справаздачы МУС за 1957 г. чытаем: „Беларускія масы ў Польшчы па прычыне сваёй ментальнасці і спецыфікі цалкам адрозніваюцца ад украінцаў і літоўцаў (...). Змянілася, таксама, сітуацыя сярод беларускай эміграцыі. У краінах Заходняй Еўропы, а перадусім у Заходняй Нямеччыне, Бельгіі, Францыі, Англіі і Італіі засталася толькі нязначная жменька нацыяналістаў. Большасць у 1954-1956 гг. эміграваала ў Амерыку і Аўстралію. З таго часу не выяўлена праяваў шпіёнскай дзейнасці з іх боку”[89]. Такі стан захоўваўся на працягу наступных гадоў. Яу вынікае са справаздач МУС за 1961-1963 гг., сярод беларускай меншасці ў Польшчы амаль не занатавана з’яваў, якія кваліфікаваліся спецслужбамі як „нацыяналістычная дзейнасць”. У рапарце за 1963 г. адзначалася: „У адрозненні ад нацыяналістычных элементаў іншых нацыянальнасцей, якія ажывіліся ў перыяд берлінскага крызісу і напружанай сітуацыі выкліканай справай Кубы, сярод асоб беларускай нацыянальнасці, якія знаходзяцца пад нашым наглядам, праяваў варожай дзейнасці не заўважана. Тым ча-

[88] AIPN, sygn. 00231/228, t. 5, k. 81.
[89] AIPN, sygn. 00231/228, t. 20, k. 316.

сам адзначалася з іх боку адсутнасць зацікаўленасці актуальнай міжнароднай сітуацыяй”[90].

Тагачасная беларуская палітычная эміграцыя не мела шырокай магчымасці правядзення самастойнай працы сярод суайчыннікаў у Польшчы. Не праяўлялі вялікай зацікаўленасці да гэтай справы і заходнія спецслужбы. Выпадак з закідам Завадскага і Петраша хутчэй належыць разглядаць як адзінкавы і пробны. Сувязі паміж „беларускімі нацыяналістамі” і беларускай эміграцыяй у асноўным мелі характар прыватных карэспандэнацый паміж роднымі альбо добрымі знаёмымі. Вядома, у часе гэтай карэспандэнцыі эмігранты цікавіліся становішчам сваіх блізкіх з-за жалезнай заслоны. Некаторыя эмігранты намагаліся дасылаць у Польшчу газеты і часопісы, выдаваныя на Захадзе. Сярод апошніх магчыма ўзгадаць газету „Бацькаўшчына” і часопіс „Барацьба”, якія атрымлівалі асобныя карэспандэнты. Але нават гэта трактавалася камуністычнымі ўладамі як праявы „нацыяналістычнай дзейнасці”. Здаралася, што пасля атрымання асобнікаў некаторыя людзі добраахвотна аддавалі іх уладам, каб не быць абвінавачанымі ў распаўсюджванні „варожай літаратуры”[91]. У 1960-я гг. высыланнем беларускіх газет у Польшчу займаўся толькі Аляксандр Лашук з Лондана[92].

Нягледзячы на пасіўныя паводзіны і неангажаванне ў антыўрадавую дзейнасць агульнай масы беларусаў у Польшчы здараліся адваротныя выпадкі. Напрыклад, напрыканцы 1964 г. спецслужбы ПНР аднатавалі распаўсюджванне ананімных лістоў антысавецкага зместу, якія былі адрасаваны да амбасадаў шэрагу заходніх краін у Варшаве, рэдакцый савецкіх газет у Вільні і Менску. Аўтар дамагаўся ад прадстаўнікоў гэных краін вынясення на міжнародны форум пытання адносна драпежніцкай савецкай асіміляцыйнай палітыкі ў дачыненні да саюзных рэспублік, а таксама заклікаў да змагання за вольнасць беларускага, украінскага і літоўскага народаў. Пазней высветлілася, што гэты адважны ўчынак здзейсніў беларус Ян Гуцька, жыхар Прушкава. Падчас следства засведчыў, што зрабіў гэта па ўласнай ініцыятыве і не належаў да ніякай падпольнай арганізацыі[93].

Па вышэйзгаданых прычынах у 1960-я гг. заўважна зменшылася зацікаўленасць спецслужбаў ПНР справай „беларускіх нацыяналістаў у краіне і на Захадзе”. Нельга аднак сцвердзіць, што яна цалкам перастала існаваць. У 1963 г. лічба інфільтраваных беларускай нацыянальнасці складала 57 асоб, якія ўтрымлівалі кантакты з беларускімі эмігрантамі на Захадзе. Аперацыйная праца па беларускай тэматыцы кан-

[90] AIPN, sygn. 00231/228, t. 37, k. 115.
[91] AIPN, sygn. 00231/228, t. 37, k. 117.
[92] AIPN, sygn. 00231/228, t. 37, k. 181.
[93] AIPN, sygn. 00231/228, t. 37, k. 180.

цэнтравалася ў гэты час вакол: 1) высвятлення характару кантактаў некаторых грамадзян з эмігрантамі і ці за гэнымі кантактамі не хавацца магчымая „варожая нацыяналістычная праца"; 2) вывучэнне дзейнасці беларускіх палітычных асяродкаў на чужыне з пункту гледжання ўсталявання з імі кантакту дзеля выкарыстання як агентаў[94]. У якасці апошніх разглядаліся такія асобы, як: Уладзімір Бортнік — рэдактар газеты „Бацькаўшчына"; Дзмітры Касмовіч — ачольнік Беларускага вызвольнага фронту і адзін з актывістаў арганізацыі Уладзімір Сенька; Надзея Абрамава — былая кіраўнічка СБМ. Акрамя таго ўвагу польскай службы бяспекі прыцягвалі Барыс Рагуля, Міхась Белямук, Васіль Лукашык, Міхась Зуй, Аляксандр Маскалік і іншыя. Праз родных і знаёмых у Польшчы з гэтымі людзьмі шукаўся кантакт[95].

Службы бяспекі ПНР займаліся распрацоўкай беларускай эміграцыі не самастойна. У значнай ступені гэта адбывалася па прапанове ці замове савецкіх хаўруснікаў. Неўзабаве, у часе агентурнага распрацавання беларускай эміграцыі дайшло да супрацоўніцтва паміж польскімі і савецкімі спецслужбамі. У якасці апошніх у асноўным выступаў Камітэт дзяржаўнай бяспекі (КДБ) БССР. Пра шчыльнае супрацоўніцтва ў гэтай справе магчыма казаць пачынаючы з другой паловы 1950-х гг. Савецкія спецслужбы на той час ужо ведалі, што ў Польшчы жывуць сваякі і блізкія многіх беларускіх эмігрантаў. У перыяд з ліпеня па кастрычнік 1956 г. КДБ БССР накіраваў у ПНР пяць сваіх агентаў з заданнем сустрэцца са сваякамі некаторых беларускіх дзеячаў на Захадзе. Аднымі з першых у поле зроку „чэкістаў" трапілі Барыс Рагуля і Аляксандр Лашук[96].

У красавіку-траўні 1958 г. у Варшаве адбылося некалькі супольных пасяджэнняў і спатканняў супрацоўнікаў МУС ПНР і КДБ БССР, падчас якіх бакі зрабілі абмен аператыўнай інфармацыяй, якая тычылася „варожай дзейнасці беларускіх нацыяналістаў у ПНР і БССР". Былі таксама ўзгодненыя планы супольных мерапрыемстваў, накіраваных на распрацоўку „беларускіх буржуазных нацыяналістаў". У выніку было вырашана, што бакі будуць стала інфармаваць адзін аднаго наконт: 1) чыннасці беларускіх арганізацый скіраванай супраць СССР і ПНР; 2) нелегальных каналаў сувязі замежных беларускіх цэнтраў з „варожымі элементамі" на тэрыторыі СССР і ПНР; 3) спосабаў дасылання эмігрантамі „нацыяналістычнай літаратуры" ў СССР і ПНР; 4) выкарыстання замежнымі беларускімі цэнтрамі жыхароў ПНР дзеля правядзення „варожай" дзейнасці супраць СССР і ПНР[97].

[94] AIPN, sygn. 00231/228, t. 39, k. 87.
[95] AIPN, sygn. 00231/228, t. 20, k. 317-318.
[96] AIPN, sygn. 00231/228, t. 37, k. 67.
[97] AIPN, sygn. 00231/228, t. 37, k. 40.

Да ліку найбольш значных супольных аперацыяў належала ўсталяванне пры дапамозе агента „Яблонскага” кантакту з а. Філафеем Нарко, які падчас нямецкай акупацыі быў праваслаўным архіепіскапам Беларусі. У тым жа часе па замове савецкага боку МУС ПНР завербавала канфідэнта „Віцебскага”, які ўтрымліваў кантакты з Міколам Шчорсам. КДБ БССР падрыхтаваў спіс адрасоў „беларускіх нацыяналістаў, якія пражывалі ў капіталістычных краінах і якія ўтрымліваюць сувязь з Інстытутам даследавання СССР”. Савецкі бок таксама параіў польскім спецслужбам, каб тыя звярнулі больш пільную ўвагу на дзеячаў Беларускага грамадска-культурнага таварыства і рэдакцыю газеты „Ніва” ў Польшчы. У сваю чаргу з удзелам службаў бяспекі ПНР адбывалася распрацаванне каталіцкага святара Уладыслава Чарняўскага, які жыў у БССР і выступаў за беларусізацыю Касцёла. Апошні меў знаёмых і аднадумцаў у Польшчы, таму польскім спецслужбам было даручана кантраляваць гэтыя сувязі[98].

У 1950-я гг. супрацоўніцтва паміж спецслужбамі абодвух краін у справе „беларускіх нацыяналістаў” галоўным чынам заключалася на ўзаемным інфармаванні. У 1959 г. КДБ БССР прасіў дапамогі польскіх хаўруснікаў у справе распрацавання былых сяброў СБМ Мячыслава Рачыцкага і братоў Занковічаў, якія жылі ў Канадзе. Акрамя таго, савецкім спецслужбам залежыла на прыездзе ў Польшчу ў адведзіны да сваякоў некаторых беларускіх эмігрантаў з ЗША, у тым ліку Міхася Белямука, Васіля Цярпіцкага і Віктара Спічонка, а таксама Уладзіміра Гуцькі, шэфа Краёвага штаба Беларускага вызвольнага фронту ў Канадзе. З мэтай збору інфармацыі наконт апошняга рабіліся спробы распрацавання яго брата, які пражываў у Польшчы[99]. На падставе дадзеных з КДБ БССР польскія спецслужбы праз сваіх інфарматараў „Руцкага” і „Міся” намагаліся намовіць да прыезду ў БССР Уладзіміра Сеньку, беларускага ветэранскага дзеяча. Ужо праз савецкіх агентаў „Ціханава” і „Волкава” службы бяспекі ПНР даведаліся пра тое, што ў Польшчы жыве брат Хведара Цімафейчыка, старшыні Згуртавання беларускіх камбатантаў у Бельгіі. З гэтай мэтай рабіліся захады, каб схіліць апошняга да наведання Польшчы. У 1975 г. канфідэнт КДБ БССР „Ванда” наведала ЗША і адбыла стустрэчу з Анатолем Суравым і намовіла яго да прыезду ў ПНР у адведзіны да сваякоў[100]. Падчас наведання родных у Польшчы меркавалася паспрабаваць завербаваць Суравога і Цімафейчыка. Па падказцы КДБ БССР службы бяспекі ПНР у лістападзе 1960 г. трапілі на след Язэпа Найдзюка, які

[98] AIPN, sygn. 00231/228, t. 37, k. 12.
[99] AIPN, sygn. 00231/228, t. 37, k. 70.
[100] AIPN, sygn. 00231/228, t. 37, k. 32.

дасюль жыў у Інавроцлаве пад прозвішчам Юзэф Александровіч, які на працягу ад лістапада 1960 па сакавік 1961 г. быў дапытаны. У выніку ён прызнаў свой удзел у дзейнасці беларускіх арганізацый падчас нямецкай акупацыі. У службовай нататцы ў справе Найдзюка адзначалася: „Паколькі дасюль ён не пазбыўся цалкам нацыяналістычных поглядаў, ёсць неабходнасць правесці з ім доўгатэрміновую ідэалагічна-выхаваўчую працу". Прапаноўвалася нават накіраваць яго ў групе турыстаў у СССР дзеля таго, каб „ён на ўласныя вочы пазнаёміўся з дасягненнямі сацыялістычнага будаўніцтва ў СССР"[101]. Беручы пад увагу тое, што Найдзюк быў чынным беларускім дзеячам яшчэ ў міжваеннай Польшчы і добра дасведчыў савецкай рэчаіснасці ў перыяд першай савецкай акупацыі (верасень 1939 — чэрвень 1941 г.) вышэйзгаданыя прапановы „ўбэкаў" выглядаюць прынамсі смешнымі і наіўнымі.

На супольнай нарадзе ў сакавіку 1961 г. былі ўзгоднены новыя планы агентурна-аператыўнага мерапрыемства. У гэты час была абмеркавана справа выкарыстання агента „Каперніка" дзеля распрацавання беларускіх цэнтраў у ЗША. 18 студзеня 1963 г. і 15 кастрычніка 1964 г. у Менску адбыліся чарговыя пасяджэнні МУС ПНР і КДБ БССР, на якіх былі апрацаваны супольныя планы мерапрыемстваў па распрацаванні беларускай палітычнай эміграцыі[102]. У 1963 г. у КДБ БССР нарадзіўся план скампраметавання ў вачах беларускай эміграцыі асобы Дзмітрыя Касмовіча — ачольніка Беларускага вызвольнага фронту (БВФ). Гэта была рэакцыя савецкіх спецслужбаў на зварот кіраўніка БВФ да прэзідэнта ЗША ў 1961 г. з прапановай накіраваць у складзе кантынгента амерыканскіх войскаў беларускіх добраахвотнікаў у Заходні Берлін. Акцыя скампраметавання заключалася на стварэнні ўражання нібы Касмовіч звязаны з савецкай выведкай. Выкананне гэтага задання было ўскладзена на МУС ПНР, паколькі на тэрыторыі Польшчы жылі кроўныя Касмовіча, якіх належала апрацаваць на акалічнасць скампраметавання іх слыннага сваяка[103]. Справа аднак скончылася паразай, бо польскім спецслужбам не ўдалося знайсці сведчанняў утрымання кантакту паміж Касмовічам і яго роднымі[104]. Па просьбе КДБ БССР у 1963 г. польскія службы бяспекі перайшлі да рэалізацыі яшчэ адной спробы скампарметавання. Гэтым разам справа тычылася прэзідэнта БЦР Радаслава Астроўскага. З гэтай мэтай у Канаду планаваўся выезд шнупара „ПВ", які павінны быў сустрэцца з выдаўцом

[101] AIPN, sygn. 00231/228, t. 37, k. 87.
[102] AIPN, sygn. 00231/228, t. 37, k. 182.
[103] AIPN, sygn. 00231/228, t. 37, k. 70, 150-151.
[104] AIPN, sygn. 00231/228, t. 37, k. 187.

тамтэйшае газеты „Беларускі Голас” Сяргеем Хмарам[105]. Рэч у тым, што ў гэты час пагоршыліся адносіны паміж апошнім і прэзідэнтам БЦР. Беручы пад увагу дадзеныя непаразуменні агент мусіў запрапанаваць Хмару апублікаваць на бачынах „Беларускага Голасу” дакументы з польскіх архіваў, якія сведчылі пра супрацоўніцтва Астроўскага з польскай выведкай у міжваенны час[106].

Па прапанове КДБ БССР у лістападзе 1964 г. МУС ПНР накіравала ў ФРГ канфідэнта „Арэк”, які меўся сустрэцца з беларускім эмігрантам Георгіем Попкам, а агент „Менскі” вырушыў у падарожжа ў Англію з мэтай спаткання з Аляксандрам Лашуком[107]. У другой палове 1960-х гг. магчымасці распрацавання беларускіх эмігрантаў для польскіх службаў бяспекі былі значна абмежаваныя. Гэта было звязана са смерцю інфарматара „Нагурнага”, а таксама пагаршэннем стану здароўя „Віцебскага” і „Беластоцкага”. Тым не менш распрацаванне адбывалася надалей. Так, агент „Кароль”, які ў гады нямецкай акупацыі быў чальцом Беларускага камітэта ў Гародні па заданні МУС ПНР усталяваў трывалы кантакт з Уладзімірам Тамашчыкам (тады ўжо архіепіскапам Беларускай аўтакефальнай праваслаўнай царквы Васілём) і Аляксеем Грыцуком — сябрам Згуртавання беларусаў у Канадзе[108].

Трэба адзначыць, што КДБ БССР займаўся таксама самастойнай распрацоўкай беларускае эміграцыі з дапамогай уласнае агентуры. Так, у 1959 г. незалежна ад агентаў МУС ПНР распрацоўкай Уладзіміра Сенькі займаўся савецкі канфідэнт „Баброў”. Іншы агент „Лахімаў” меў карэспандэнцыйную сувязь з Белямуком[109].

У межах супрацоўніцтва паміж польскімі і савецкімі спецслужбамі практыкавалася выданне першымі ў рукі другіх некаторых польскіх грамадзян беларускай нацыянальнасці. Былі гэта асобы, якія ў гады Другой сусветнай вайны дзейнічалі на тэрыторыі Беларусі ў арганізацыях, створаных немцамі. Напрыклад, у ліку гэтых ахвяр апынуўся былы сябра СБМ Янка Жамойцін, які быў арыштаваны ў 1949 г. і перададзены на савецкі бок, дзе яго чакаў вырак[110]. Яскравым прыкладам падобнага кшталту можа быць арышт МГБ 14 красавіка 1949 г. Глеба Багдановіча. Гэта быў былы вайсковец вышэйзгаданага спецыяльнага батальёна „Дальвіц”, які разам з групай камандасаў у снежні 1944 г. дэсан-

[105] Сяргей Сіняк (Хмара) — беларускі дзеяч на эміграцыі. Падчас нямецкай акупацыі працаваў у цывільнай адміністрацыі ў Слоніме. Пасля вайны жыў у Канадзе, дзе выдаваў газету „Беларускі Голас”.

[106] AIPN, sygn. 00231/228, t. 37, k. 158.

[107] AIPN, sygn. 00231/228, t. 37, k. 182.

[108] AIPN, sygn. 00231/228, t. 37, k. 181.

[109] AIPN, sygn. 00231/228, t. 14, k. 69.

[110] AIPN, sygn. 00231/228, t. 14, k. 96.

таваўся на тэрыторыі БССР з мэтай разгортвання антысавецкай партызанкі на заплеччы Чырвонай Арміі. У хуткім часе Багдановіч далучыўся да акоўскага аддзела і браў удзел у баявых аперацыях. 28 ліпеня 1945 г. у складзе аддзела сяржанта В. Янчэўскага „Лялюся" з баямі перакрочыў савецка-польскую мяжу. Яшчэ пэўны час удзельнічаў у падпольным руху „Вольнасць і Незалежнасць" (ВіН) на тэрыторыі Сакольскага і Аўгустоўскага паветаў[111]. На момант арышту працаваў лекарам у 62-м пяхотным палку 18-й пяхотнай дывізіі. У СССР ён быў асуджаны да 25 гадоў лагераў. Пасля вызвалення ў 1957 г. жыў на Беларусі. Выпадкі перадачы польскіх грамадзян беларускай нацыянальнасці ў рукі савецкіх спецслужбаў здараліся і пазней. У якасці прыкладу можна разгледзець выпадак з былым афіцэрам БКА Уладзімірам П., які быў арыштаваны ў 1951 г. на тэрыторыі Познаньскага ваяводства. У службовай нататцы, падрыхтаванай афіцэрам бяспекі, чытаем: „Беручы пад увагу цяжар яго злачыннай дзейнасці (...) належыць яго аддаць пад суд альбо ў якасці беларускага нацыяналіста перадаць у СССР як савецкага грамадзяніна"[112].

Асобную бачыну ў справе распрацавання т.зв. „беларускіх нацыяналістаў" займае стварэнне ў 1956 г. і дзейнасць Беларускага грамадска-культурнага таварыства (БГКТ). Напрыканцы 1965 г. таварыства налічвала 4 607 чальцоў. Падобным чынам, як у выпадку з украінцамі, кантролем была прасякнута замежная карэспандэнцыя сяброў арганізацыі. Спецслужбы старанна сачылі за дзейнасцю газеты „Ніва". Татальны кантроль абгрунтоўваўся тым, што „асяроддзе беларускай інтэлігенцыі, якое пераважна гуртуецца вакол БГКТ, „Нівы", Медычнай акадэміі заслугоўвае ўвагі па той прычыне, што да іх даходзяць весткі ад прадстаўнікоў нацыяналістычна-выведных цэнтраў, якія ўплываюць на іх у нацыяналістычным духу"[113]. У сувязі з гэтым асаблівую зацікаўнасць спецслужбы мелі да прадстаўнікоў інтэлігенцыі, звязанай з БГКТ, якія працавалі на дзяржаўных пасадах. На думку „ўбэкаў" гэтыя людзі з'яўляліся „вельмі падатнай глебай дзеля выкарыстання іх беларускімі буржуазнымі нацыяналістамі ў варожых мэтах"[114].

З моманту заснавання БГКТ і на працягу ўсяго існавання ПНР спецслужбы краіны шукалі ў дзейнасці арганізацыі разнастайныя праявы „нацыяналізму". На думку ўлад да ліку апошніх належала нават незадаволенасць і напакой некаторых беларускіх дзеячаў узмацненнем русіфікацыі ў БССР і імклівымі тэмпамі асіміляцыі беларускай меншасці ў Поль-

[111] AIPN, sygn. 00231/228, 15, k. 114.
[112] AIPN, sygn. 00231/228, t. 17, k. 165.
[113] AIPN, sygn. 00231/228, t. 15, k. 106.
[114] AIPN, sygn. 00231/228, t. 15, k. 120.

шчы. Неўзабаве не здзіўляе насцярожанае стаўленне службаў бяспекі да выказванняў некаторых беларусаў, накшталт: „калі знікне мова, то беларускі народ згіне" альбо „беларусы павінны мець уласны тэатр і музей". У службовай нататцы „Справа беларускага нацыяналізму" ад 22 снежня 1965 г. чытаем: „Былыя сябры беларускіх камітэтаў і іншых нацыяналістычных арганізацый перыяду акупацыі, а таксама асобныя прадстаўнікі інтэлігенцыі выказваюць жаль з нагоды працэсаў натуральнай асіміляцыі сярод моладзі. У імкненні супрацьстаяць гэнаму працэсу намагаюцца падтрымліваць нацыянальныя і рэлігійныя традыцыі і зачыняюцца ў сваім коле"[115]. Камуністычная ўлада была занепакоена тым, што ў складзе БГКТ апынуліся „нацыяналістычныя элементы, якія маюць антысавецкія перакананні і арыентуюцца на беларускія нацыяналістычныя цэнтры за мяжой, з якімі ўсталёўваюць кантакт і атрымліваюць ад іх нацыяналістычную літаратуру"[116]. Варта падкрэсліць, што вышэйзгаданыя кантакты абмяжоўваліся ліставаннем паміж некаторымі прадстаўнікамі газеты „Ніва" і рэдакцыяй беларускай эміграцкай газеты „Бацькаўшчына ", якая выдавалася ў Мюнхене. Як вынікае з ліставання, эмігранты запрапанавалі абмен выдавецкай прадукцыяй, у выніку ў „Ніву" пачалі паступаць газеты і часопісы з Парыжа, Рыма і ЗША. Асобных дзеячаў БГКТ абвінавачвалі ў „паклёпніцтве на савецкі дзяржаўны і сацыяльны лад" і „захапленні ажыўленнем нацыяналістычнай дзейнасці сярод беларускай інтэлігенцыі ў Польшчы"[117]. На фоне дадзеных фактаў цяжка не пагадзіцца з тымі гісторыкамі, якія лічаць, што у пэўнай ступені БГКТ была створана дзеля здэмаскавання дасюль нявыкрытых „беларускіх нацыяналістаў". Улады разлічвалі на тое, што апошнія, даведаўшыся пра існаванне легальнай беларускай арганізацыі ў ПНР, будуць спрабаваць ажыццяўляць сваю „варожую" дзейнасць і такім чынам легалізуюцца, пасля чаго іх будзе нескладана кантраляваць. Татальны кантроль над таварыствам быў звязаны з далейшым распрацаваннем беларускіх эмігрантаў, якія несумненна не маглі не звярнуць увагі на актыўнасць беларускай дыяспары ў Польшчы і спрабаваць усталяваць з імі сувязь. Службы бяспекі ПНР намагаліся выкарыстаць кожную магчымую нагоду, каб распрацоўваць беларускую эміграцыю. Так, напрыклад, беларускі эміграцыйны дзеяч Аляксандр Стагановіч прапанаваў БГКТ выслаць двух беларускіх студэнтаў з Польшчы ў Бельгію дзеля навучання ў Лювэнскім універсітэце. Пасля атрымання гэтай інфармацыі МУС стрымгалоў пачало шукаць адпаведных кандадатаў, каб у якасці сваіх агентаў накіраваць іх у Бельгію[118].

[115] AIPN, sygn. 00231/228, t. 37, k. 180.
[116] AIPN, sygn. 00231/228, t. 14, k. 15.
[117] AIPN, sygn. 00231/228, t. 14, k. 16.
[118] AIPN, sygn. 00231/228, t. 37, k. 71.

Як у большасці такога кшталту выпадкаў за дадзенымі акцыямі стаялі савецкія спецслужбы, а менавіта КДБ БССР. У1969 г. Менск паінфармаваў Варшаву аб тым, што „беларускія нацыяналісты за мяжой, асабліва ў ЗША, надта цікавяцца беларускай калоніяй ў Польшчы і імкнуцца выклікаць сярод БГКТ нацыяналістычныя тэндэнцыі”[119]. Нагоду гэтай заяве дало наведанне Польшчы ў 1968-1969 гг. у якасці турыстаў шэрагу беларускіх эмігрантаў з ЗША. Гаворка ішла пра Юрыя Станкевіча, Сяргея Карніловіча і Мікалая Прускага, якія ў часе свайго знаходжання ў ПНР сустрэліся з актывістамі таварыства ў Варшаве, Гайнаўцы, Беластоку. У нататцы ад 16 чэрвеня 1969 г. КДБ БССР раіў сваім польскім хаўруснікам распачаць супольнае распрацаванне асоб з-за мяжы, якіх належала завербаваць з мэтай вызначэння заданняў беларускіх эміграцыйных цэнтраў[120].

Здаралася, што нагоду да ўзмацнення кантролю над беларускім асяроддзем з боку службаў бяспекі давалі складаныя нацыянальныя стасункі ва ўсходняй частцы Беластоцкага ваяводства, якія мелі месца падчас Другой сусветнай вайны. З’яўленне БГКТ на Беласточчыне выклікала ў пэўнай часткі мясцовага польскага насельніцтва непакой і трывогу, паколькі некаторыя памяталі дзейнасць Беларускага камітэта падчас нямецкай акупацыі. Так, напрыклад, 4 студзеня 1957 г. група палякаў праваслаўнага веравызнання з паўночна-ўсходняй часткі ваяводства звярнулася з адкрытым лістом да ЦК ПАРП, старшыні Рады Міністраў, ваяводскіх і мясцовых улад з просьбай звярнуць пільную ўвагу на дзейнасць БГКТ. Ліст утрымліваў пратэст супраць таго, што дзеячы таварыства залічваюць усіх без вынятку праваслаўных жыхароў ваяводства да беларусаў. Асобныя актывісты арганізацыі абвінавачваліся ў падтрымцы культу асобы падчас кіравання Берута. Падкрэсліваліся факты тэрарызавання міліцыянтамі беларускай нацыянальнасці мясцовых палякаў з мэтай схілення іх да дэкларавання сябе беларусамі. У гэным звароце адзначалася нават, што дзеячы БГКТ рыхтуюць спробу адарвання ўсходняй Беласточчыны ад Польшчы з паслядоўным далучэннем яе да СССР. У выніку гэтага справа трапіла на разгляд у МУС і стала яшчэ адной нагодай да інфільтрацыі таварыства з боку дзяржавы[121].

У 1964 г. здарыўся яшчэ адзін цікавы выпадак. Мясцовыя ўлады Гайнаўкі зацікавіліся мясцовым беларусам, які ў траўні і снежні 1963 г. разаслаў лісты аднольнакава зместу ў Раду Міністраў ПНР, а таксама да 14 дыпламатычных прадстаўніцтваў замежных краін (ЗША, Кана-

[119] AIPN, sygn. 00231/228, t. 41, k. 309.
[120] AIPN, sygn. 00231/228, t. 41, k. 309.
[121] AIPN, sygn. 00231/228, t. 39, k. 305-310.

да, Італія, Нідэрланды, Нарвегія, Кітай і інш.) у Варшаве. Са зместу звароту бачна, што аўтар кіраваўся асабістай крыўдай, якая, як ён пісаў, вынікала з нацыянальнай дыскрымінацыі[122].

Варта падкрэсліць, што ў сярэдзіне 1970-х гг. для спецслужбаў Польшчы справа т.зв. „беларускіх нацыяналістаў" фактычна перастае існаваць. За сімвалічны момант спынення гэтай справы магчыма лічыць 1974 г., якім датуецца апошняя дакументацыя, звязаная з „беларускімі нацыяналістамі ў краіне і іх палітычнымі цэнтрамі на Захадзе". З гэтага часу кантролю падлягалі пераважна асобныя людзі, тым часам як у аператыўнай дакументацыі знікаюць агульныя паняткі „беларускія нацыяналісты ў краіне" альбо „беларускія цэнтры на Захадзе".

Падагульняючы стаўленне службаў бяспекі ПНР у адносінах да актыўнай альбо нацыянальна свядомай часткі польскага грамадства беларускай нацыянальнасці належыць сцвердзіць наступнае: па маральных і юрыдычных прычынах неабходным магчыма лічыць толькі пошук і пакаранне ваенных злачынцаў. У пераважнай аднак большасці выпадкаў перасследаванне т.зв. „беларускіх нацыяналістаў" мела палітычныя меркаванні і таму належыць гэта трактаваць як з'яву грамадзянскай дыскрымінацыі, уласцівую кожнаму таталітарнаму ладу, які панаваў у краінах сацыялістычнага лагера. У адрозненні ад украінскай апазіцыі, якая ў першыя паваенныя гады праяўлялася нават у дзейнасці ўзброенага падполля, беларускае асяроддзе не было настолькі арганізаваным і моцным. На тэрыторыі пасляваеннай Польшчы не існавала беларускай канспіратыўнай сеткі. Адсутнічаюць таксама звесткі наконт дзейнасці ўзброенай партызанкі. Сотні людзей класіфікаваліся спецслужбамі як „нацыяналісты" альбо „буржуазныя нацыяналісты" толькі за тое, што яны былі нацыянальна свядомымі і не прымалі пасляваеннай рэчаіснасці і палітычнага ладу, які панаваў тады ў Польшчы і Беларусі. Многія з іх у пераломны момант гісторыі — падчас Другой сусветнай вайны — спрычыніліся да змагання супраць савецкай улады, а пасля вайны намагаліся ўратавацца ад савецкага перасследу ў Польшчы. Побач з іншадумцамі іншых нацыянальнасцей яны былі раўнапраўнымі ахвярамі камуністычнага рэжыму. У сувязі з тым немагчыма апраўдаць парушэнні правоў чалавека і татальны кантроль, які зведала ў ПНР дадзеная катэгорыя грамадзян.

Streszczenie

Po zakończeniu wojny w wyniku akcji repatriacyjnej na terytorium Polski znalazła się liczna grupa Białorusinów z Wileńszczyzny, Polesia i Nowogródczyzny. Większość z nich aktywnie uczestniczyła w życiu narodowym, była członkami białoruskich organizacji lub

[122] AIPN, sygn. 00231/228, t. 39, k. 270.

formacji wojskowych. Do Polski przesiedlali się jako Polacy, uciekając przez władzą sowiecką. Wkrótce stali się obiektem zainteresowania polskich i sowieckich organów bezpieczeństwa. W dokumentach polskiej służby bezpieczeństwa określeni zostali mianem „białoruskich nacjonalistów". Paradoksalnie, do tej kategorii byli także zaliczani Białorusini walczący w szeregach Armii Krajowej i w polskich formacjach wojskowych na Zachodzie. W 1949 r. w MSW został utworzony referat ds. mniejszości narodowych, który zajmował się badaniem okupacyjnej przeszłości. Charakterystyki większości białoruskich działaczy zawierały sformułowania: „przejawia wrogi stosunek do Polski i Związku Radzieckiego". Najwięcej „białoruskich nacjonalistów" zidentyfikowano na terenie województw zachodnich, gdzie przesiedlili się repatrianci z Białorusi Radzieckiej i Wileńszczyzny. W polu zainteresowania polskich służb specjalnych znalazła się także białoruska emigracja. Do najważniejszych przedstawicieli białoruskiego życia narodowego na emigracji udało się wysłać agentów, którzy zdołali zdobyć zaufanie inwigilowanych. Większość operacji była uzgadniana lub realizowana na zlecenie radzieckiego Komitetu Bezpieczeństwa Państwowego (KGB).